10 студзеня	– 90 гадоў	таму (1923) нарадзілася Дарафеенка Ніна Іванаўна, беларускі гісторык, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, удзельніца Вялікай Айчыннай вайны, адна з аўтараў кнігі "Віцебскае падполле", ураджэнка Віцебскага раёна.
10 студзеня	– 15 гадоў	таму (1998) створана Шаркаўшчынскае раённае прадпрыемства па матэрыяльна-тэхнічнаму абслугоўванню і забеспячэнню аграпрамкомплексу.
14 студзеня	– 100 гадоў	таму (1913) нарадзіўся Халеў Васіль Дзмітрыевіч (1913–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення г. Полацка.
14 студзеня	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Дубко Аляксандр Іосіфавіч (1938–2001), гаспадарчы і грамадскі дзеяч Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, Герой Беларусі, ураджэнец в. Ілава Шумілінскага раёна.
14 студзеня	– 65 гадоў	таму (1948) нарадзіўся Гальпяровіч Навум Якаўлевіч, беларускі пісьменнік, паэт, журналіст, ураджэнец г. Полацка.
14 студзеня	– 60 гадоў	таму (1953) нарадзіўся Лук'яненка Віктар Рыгоравіч, беларускі жывапісец, член Саюза мастакоў Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.
15 студзеня	– 115 гадоў	таму (1898) выйшаў першы нумар газеты "Віцебскі лісток". Выдавалася да красавіка 1899 г.
15 студзеня	– 105 гадоў	таму (1908) нарадзіўся Азгур Заір Ісакавіч (1908–1995), беларускі скульптар, народны мастак Беларусі, народны мастак СССР, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Маўчаны Сенненскага раёна.
15 студзеня	– 75 гадоў	таму (1938) ўтворана Віцебская вобласць з цэнтрам у г. Віцебску.

17 студзеня	– 60 гадоў	таму (1953) нарадзілася Жарнасек Ірына Францаўна, беларуская пісьменніца, журналістка, ураджэнка в. Чаранкі Глыбоцкага раёна.
17 студзеня	– 40 гадоў	таму (1973) створана Полацкае вытворчае лесанарыхтоўчае аб'яднанне. Зараз ААТ "Полацклес".
18 студзеня	– 40 гадоў	таму (1973) нарадзілася Кандратава Алена Дзмітрыеўна, беларуская спартсменка (армрэстлінг, пауэрліфтынг), заслужаны майстар спорту Беларусі, чэмпіёнка свету і Еўропы, ураджэнка г. Браслава.
19 студзеня	– 60 гадоў	таму (1953) нарадзіўся Гайлукевіч Валерый Уладзіміравіч, беларускі ваенны дзеяч, ураджэнец г.п. Бягомль Докшыцкага раёна.
21 студзеня	– 55 гадоў	таму (1958) в. Ветрына Ветрынскага раёна нададзены статус гарадскога пасёлка. Зараз – у Полацкім раёне.
21 студзеня	– 15 гадоў	таму (1998) Віцебскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту прысвоена імя П.М. Машэрава.
23 студзеня	– 105 гадоў	таму (1908) нарадзіўся Барадаўка Павел Рыгоравіч (1908–1968), поўны кавалер ордэна Славы, удзельнік савецка-фінляндскай вайны, Вялікай Айчыннай вайны, Курскай бітвы, бітвы за Маскву, ураджэнец в. Асташова Чашніцкага раёна.
23 студзеня	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Шэвераў Аляксандр Каліністратавіч, беларускі мастак, педагог, ураджэнец г. Оршы. Працуе ў кніжнай графіцы. Творы мастака захоўваюцца ў фондах музейнага комплексу "Гісторыя і культура Аршаншчыны".
23 студзеня	– 65 гадоў	таму (1948) адкрыты мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза К.С. Заслонава ў г. Оршы.
24 студзеня	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзілася Ярмак Людміла Іосіфаўна (1938–2003), актрыса, педагог, ураджэнка г. Полацка.
25 студзеня	– 205 гадоў	таму (1808) нарадзіўся Сабольшчыкаў Васіль Іванавіч (1808–1872), бібліятэкар і архітэктар Імператарскай Публічнай Бібліятэкі, выдатны арганізатар бібліятэчнай справы ў Расіі XIX ст., ураджэнец г. Віцебска.

Акцёр яркай самабытнай індывідуальнасці, ён з вялікім поспехам працаваў над вобразамі з беларускага рэпертуару. Мякка, на паўтанах, але з глыбокай псіхалагічнай напоўненасцю, немудрагелістай праўдзівасцю праводзіў ролю Мульціка ў спектаклі «Вечар» па п’есе А. Дударава. З драматычнай абвостранасцю маляваў вобразы персанажаў класічных п’ес: Ларэнца, Глостэр («Рамэа і Джульета», «Кароль Лір» У. Шэкспіра), Іван Пятровіч Вайніцкі («Дзядзька Ваня» А. Чэхава).

Цікавыя завостраныя характары стварыў Я. Шыпіла ў спектаклях па творах сучаснай драматургіі: Ягор Палушкін («Не страляйце ў белых лебедзяў» паводле Б. Васільева), Кірпаты («Энергічныя людзі» В. Шукшына), «Хачу здымацца ў кіно» Н. Саймана.

Акцёр дасканала валодаў арганікай жыцця на тэатральных падмостках, меў прыродную абаяльнасць, дзякуючы чаму яго вобразам уласціва поўная дакладнасць і ўнутраная правабнасць.

У творчасці Я. Шыпілы жыццёвая праўда, арганічнасць і шчырасць сцэнічнага існавання, сакавіты народны гумар спалучаліся з глыбокім пранікненнем у псіхалагічную сутнасць характараў, у лепшых вобразах адчувалася імкненне да мастацкага абагульнення. Акцёр зняўся ў беларускім фільме «На зыходзе дня», тэлефільме «Новая зямля».

Памёр 28 лістапада 1999 г. Пахаваны ў в. Свяціца Верхнядзвінскага раёна.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Акцёры** і ролі : Я. Шыпіла // Народнае слова. — 1997. — 9 студз. — С. 5.

2. **Глацёнак, Н.** Абяцаў і здзейсніў! / Н. Глацёнак // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). — 2003. — 10 кастр. — С. 4.

3. **Іваноўскі, В. С.** Шыпіла Яўген Патафеевіч / В. С. Іваноўскі // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; пад. агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. — Мн. : БелЭн, 2003. — Т. 2. — С. 546.

вядомых людзей Беларусі / пад рэд. Н. Гілевіча. — Мн. : ГА БТ «Кніга», 2002. — Вып. 1. — С. 421—425.

ШЫПІЛА ЯЎГЕН ПАТАФЕЕВІЧ

Да 70-годдзя з дня нараджэння (1943)

Яўген Патафеевіч Шыпіла нарадзіўся 7 кастрычніка 1943 года ў в. Відокі Верхнядзвінскага раёна. Беларускі акцёр. Народны артыст Беларусі (1984).

Працаваў у Відоцкай сельскай бібліятэцы. Пасля заканчэння курсаў культработнікаў у Мінску стаў інструктарам раённага Дома культуры. На працягу шэрагу гадоў Яўген быў на камсамольскай рабоце, а ў вольныя часіны аддаваў сябе самадзейнай сцэне – чытаў вершы, іграў у драматычных спектаклях.

З 1967 года Я. Шыпіла працаваў нязменна ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Коласа пасля паспяховага заканчэння студыі пры тэатры. На сцэне коласаўскага тэатра і раскрыўся яго шматгранны акцёрскі талент. Вобразам, якія стварaў акцёр, былі ўласцівы жыццёвая верагоднасць, псіхалагічная дакладнасць. Найбольш значнымі работамі акцёра лічацца: Дзед Курыла («Сымон-музыка» паводле Я. Коласа), Іван Швед («Таблетку пад язык» А. Макаёнка), Буслай («Парог» А. Дударава), Канстанцін Заслонаў («Паядынак» М. Матукоўскага), Несцерка («Несцерка» В. Вольскага).

26 студзеня	– 115 гадоў	таму (1898) нарадзіўся Барэйка Аркадзь Аляксандравіч (1898–1955), Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр, удзельнік грамадзянскай вайны, савецка-фінляндскай вайны, Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Дубраўкі Полацкага раёна.
26 студзеня	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Яглоў Валерый Мікалаевіч, беларускі хімік, доктар хімічных навук, прафесар, акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі, ураджэнец г. Віцебска.
27 студзеня	– 90 гадоў	таму (1923) нарадзіўся Казлоўскі Аляксандр Сцяпанавіч, жывапісец, заслужаны работнік культуры Беларусі, член Саюза мастакоў СССР, дацэнт, ураджэнец в. Вялікія Труханавічы Чашніцкага раёна.
30 студзеня	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Гурын Валерый Мікалаевіч (1938–2007), беларускі вучоны ў вобласці фізіялогіі чалавека і жывёл, акадэмік НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.
31 студзеня	– 110 гадоў	таму (1903) нарадзіўся Белабародаў Апанас Паўланцьевіч (1903–1991), савецкі военачальнік, камандуючы 43-й арміяй, двойчы Герой Савецкага Саюза, генерал арміі, Ганаровы грамадзянін г. Віцебска.
31 студзеня	– 100 гадоў	таму (1913) ў Віцебску пачало сваю дзейнасць культурна-асветніцкае таварыства "Асвета". Існавала да канца верасня 1913 г.

ЛЮТЫ

1 лютага	– 45 гадоў	таму (1968) створана швейная фабрыка "Віцябчанка".
1 лютага	– 40 гадоў	таму (1973) нарадзіўся Каравай Леанід Пятровіч, беларускі спартсмен (пажарна-выратавальны спорт), майстар спорту Беларусі міжнароднага класа, чэмпіён свету, ураджэнец в. Пераслова Міёрскага раёна.
2 лютага	– 50 гадоў	таму (1963) нарадзіўся Балабанаў Юрый Анатольевіч, беларускі спартсмен (спартыўная гімнастыка), майстар спорту СССР міжнароднага класа, чэмпіён свету, ураджэнец г. Віцебска.
2 лютага	– 15 гадоў	таму (1998) ў Віцебску створаны шосты тэлевізійны канал (6ТВК).
3 лютага	– 115 гадоў	таму (1898) ў Віцебску адбыўся першы сеанс кінематографа.
3 лютага	– 80 гадоў	таму (1933) нарадзіўся Гусакоў Валянцін Кузьміч, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар біялагічных навук, прафесар, ураджэнец в. Ужляціна Шумілінскага раёна.
5 лютага	– 90 гадоў	таму (1923) нарадзіўся Шчамялёў Леанід Дзмітрыевіч, беларускі жывапісец, народны мастак Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.
5 лютага	– 70 гадоў	таму (1943) нарадзіўся Жалязоўскі Анатоль Пятровіч, беларускі празаік, ураджэнец в. Крапіўна Аршанскага раёна.
5 лютага	– 45 гадоў	таму (1968) выпусціў першую прадукцыю Полацкі хімкамбінат.
7 лютага	– 515 гадоў	таму (1498) Полацк атрымаў Магдэбургскае права.
7 лютага	– 90 гадоў	таму (1923) нарадзіўся Рубіс Павел Іванавіч (1923–1996), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец в. Мікулёнкі Расонскага раёна.
7 лютага	– 55 гадоў	таму (1958) нарадзіўся Бурдыка Павел Уладзіміравіч, паэт, журналіст, ураджэнец в. Заборцы Докшыцкага раёна.

светаадчування, арыгінальнасць каляровага бачання, шматслаёвая тэхніка жывапісу, асаблівасць і непаўторнасць почырку, імкненне да эксперыменту.

Кніжная і станковая графіка праходзяць праз усю творчасць Н. Шчаснай. Ёй створаны серыі графічных лістоў, афармлена мноства кніг, якія былі адзначаны дыпломамі рэспубліканскіх конкурсаў. Прызнанне і права друкавацца ў іншых краінах Еўропы атрымала кніга «Сказки, полные чудес» (1979), прысвечаная Міжнароднаму году дзіцяці.

З выставамі, якіх было больш за пяцьдзясят, Шчасная аб'ездзіла паўсвету. Многія работы мастачкі знаходзяцца ў музеях, галерэях і прыватных калекцыях.

Н. Шчасная належыць да той кагорты мастакоў, чыя творчасць, нават калі мастак уступіў у пару сталасці, развіваецца далей. Галоўная ўмова для гэтага – няспынныя пошукі, душэўная маладосць аўтара.

З 1965 г. жыве і працуе ў Мінску.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Пракапцоў, У. І.** Нінель Шчасная / У. І. Пракапцоў, І. В.Харытановіч, Т. М. Карэліна. — Мн. : Беларусь, 1984. — 59 с.

2. **Салавей, Л. Ф.** Шчасная Нінэль Іванаўна / Л. Ф. Салавей // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. — Т. 5. — С. 598.

3. **Счастная** Нинель Ивановна // Республика Беларусь : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. — Т. 7. — С. 169—170.

4. **Счастная, Н. И.** Живопись – в стихи! Стихи – в живопись! / Н. И. Счастная, В. В. Лобач. — Мн. : Звезды Гор, 2006. — 80 с.

5. **Шчасная** Нінэль Іванаўна // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БэлЭн, 2003. — Т. 17. — С. 497.

6. **Шчасная** Нінэль Іванаўна // Шчыра як на духу : споведзі

КАСТРЫЧНІК

ШЧАСНАЯ НІНЭЛЬ ІВАНАЎНА

Да 80-годдзя з дня нараджэння (1933)

Нарадзілася 25 кастрычніка 1933 г. у г. Полацку Віцебскай вобласці. Беларуская мастачка, графік, архітэктар, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

Скончыла Мінскае мастацкае вучылішча, у 1961 г. – Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна ў г. Ленінградзе. У мастацкіх выставах удзельнічае з 1961 г. З 1961 па 1965 год займалася афармленнем інтэр'ера ў г. Душанбе. Працуе ў жанрах партрэта, пейзажа, у станковай і кніжнай графіцы, а таксама ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

Творчасць мастачкі цесна звязана з нацыянальнай культурай беларускага народа. У яе жывапісе выразна гучыць тэма Радзімы, непадзельнасць чалавека і навакольнага асяроддзя. З жывапісных твораў можна адзначыць «Ковровщицы», «Беларуская дзяўчына», «Вясёлка», «Пад сонейкам», «Капель», «Васількі», «Пасля змены». Вялікай Айчыннай вайне прысвечаны карціны «Адзінокая», «Налібоцкая пушча» і іншыя. Мастачкай створаны партрэты І. Мележа, У. Дубоўкі, І. Шамякіна, Цёткі, А. Макаёнка і іншых вядомых асоб. Карціны «Бухара», «1974 год у Мінску», «Маё нараджэнне» таксама прыцягваюць увагу прыхільнікаў выяўленчага мастацтва. Творам Н. Шчаснай уласцівы мяккасць і лірызм

8 лютага	– 130 гадоў	таму (1883) нарадзіўся Гавяза Сямён Антонавіч (1883–1914), Георгіеўскі кавалер, ураджэнец в. Вязкі Браслаўскага раёна.
9 лютага	– 50 гадоў	таму (1963) на Полацкім нафтаперапрацоўчым заводзе атрыманы першы бензін. Зараз ААТ "Нафтан".
10 лютага	– 90 гадоў	таму (1923) ў Віцебску ўпершыню адбылося першынство па лыжных гонках.
13 лютага	– 120 гадоў	таму (1893) заснавана Заронаўская базавая школа.
15 лютага	– 100 гадоў	таму (1913) нарадзілася Марозава Настасся Ягораўна (1913–2010), Герой Сацыялістычнай Працы, даярка племсаўгаса "Рэканструктар" Талачынскага раёна.
17 лютага	– 50 гадоў	таму (1963) нарадзілася Іванова Лілія Барысаўна, беларуская спартсменка (скачкі на батуце), заслужаны майстар спорту Беларусі, чэмпіёнка свету і Еўропы, ураджэнка г. Віцебска.
19 лютага	– 30 гадоў	таму (1983) ў Полацкім Сафійскім саборы адкрыта гарадская канцэртная зала.
20 лютага	– 110 гадоў	таму (1903) нарадзіўся Даватар Леў Міхайлавіч (1903–1941), Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр, ураджэнец в. Хоціна Бешанковіцкага раёна.
20 лютага	– 75 гадоў	таму (1938) Орша і Аршанскі раён увайшлі ў склад створанай Віцебскай вобласці.
21 лютага	– 50 гадоў	таму (1963) нарадзіўся Лютынскі Віктар Паўлавіч, гісторык, краязнавец, ураджэнец г. Оршы.
23 лютага	– 135 гадоў	таму (1878) нарадзіўся Малевіч Казімір Севярынавіч (1878–1935), мастак, кіраўнік майстэрні Народнай мастацкай школы ў Віцебску (1919 г.), адзін з заснавальнікаў абстрактнага мастацтва.
24 лютага	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Скурко Іосіф Уладзіміравіч (1938–1989), паэт-песеннік, перакладчык, ураджэнец в. Пілікаўшчына Пастаўскага раёна.

26 лютага – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Машэраў Пётр Міронавіч (1918–1980), партыйны дзеяч, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Шыркі Сенненскага раёна.

27 лютага – 115 гадоў таму (1898) нарадзіўся Шчарбакоў Васіль Карпавіч (1898–1938), беларускі гісторык, грамадскі дзеяч, ураджэнец в. Дуброўка Аршанскага раёна.

28 лютага – 55 гадоў таму (1958) ў Віцебску ўступіў у строй завод радыёдэталей. Цяпер – ВА "Маналіт".

САКАВІК

55 гадоў таму (1958) вёсцы Расоны Расонскага раёна нададзены статус гарадскога пасёлка.

20 гадоў таму (1993) створаны ансамбль народнай музыкі "Талака" на базе Наваполацкага музычнага вучылішча. Ансамблю прысвоена званне "народны".

1 сакавіка – 90 гадоў таму (1923) нарадзілася Асмалоўская Зоя Васільеўна (1923–2012), актрыса тэатра кіно, заслужаная артыстка Беларусі, ураджэнка г. Оршы.

1 сакавіка – 70 гадоў таму (1943) нарадзіўся Пецюкевіч Уладзімір Генрыхавіч, паэт-песеннік, ураджэнец в. Цяцеркі Браслаўскага раёна.

1 сакавіка – 30 гадоў таму (1983) ў Віцебску ўведзена ў строй новая тэлевізійная вышка на Юр'евай горцы.

2 сакавіка – 100 гадоў таму (1913) нарадзіўся Пучкароў Мікалай Рыгоравіч (1913–1975), адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец Шумілінскага раёна.

4 сакавіка – 75 гадоў таму (1938) нарадзіўся Трушко Леанід Ігнатавіч (1938–2010), акцёр тэатра імя Я. Коласа, заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Бярозка, У.** Свой пункт гледжання / У. Бярозка // Віцебскі рабочы. — 1998. — 25 верас. — С. 8.

2. **Маўзон** Аркадзь // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БэлЭн, 2000. — Т. 10. — С. 217.

3. **Маўзон** Аркадзь // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1994. — Т. 4. — С. 253—256.

4. **Маўзон** Аркадзь // Памяць : Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : БелЭн, 2003. — Кн. 2. — С. 532—533.

5. **Падстаўленка, В. Ф.** Асноўныя аспекты сучаснай рэцэпцыі п'есы А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў» / В. Ф. Падстаўленка // Віцебшчына ў 1941—1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць : матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18—19 чэрвеня 2009 г. / рэдкал.: В. У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.] ; УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» [і інш.]. — Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2009. — С. 281—285.

6. **Шарендо, В.** Если ты человек / В. Шарендо // Вечерний Витебск. — 1998. — 3 окт. — С. 4.

«Камінтэрн». Ён памёр у 1920 годзе. Маці, Любоў Барысаўна, працавала на швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі». У 1931 годзе А. Маўзон скончыў сямігадовую школу ў Віцебску, затым – фабрычна-завадское вучылішча металістаў. У 1935–1936 гадах працаваў токарам на заводзе «Камунар» (цяпер імя С. Кірава) у Мінску, адначасова вучыўся ў драматычнай студыі пры БДТ-1, але не скончыў яе па сямейных абставінах і вярнуўся ў Віцебск. Адразу паступіў у калектыў БДТ-2 (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа), дзе працаваў акцёрам, асістэнтам рэжысёра.

З 1946 г. А. Маўзон – загадчык аддзела культуры рэдакцыі газеты «Віцебскі рабочы», з 1951 г. – начальнік сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм», у 1965–71 гг. – рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. У час Вялікай Айчыннай вайны ў 1941–44 гг. разам з тэатрам імя Я. Коласа быў эвакуіраваны ў г. Уральск, потым у г. Арэхава-Зуева. Калі вярнуўся ў Віцебск, пачаў збіраць матэрыялы пра легендарнага партызана Канстанціна Заслонава.

А. Маўзон пісаў на рускай і беларускай мовах, у друку пачаў выступаць з 1946 года. Яго першая п'еса – «Канстанцін Заслонаў» (1947 г.). У 1949 г. быў зняты аднайменны мастацкі фільм па яго сцэнарыю. А. Маўзон – аўтар шматлікіх пастаўленых п'ес: «Наталля Крыўцова» (1954), «У ціхім завулку» (1955), «Непрымірымасць» (1956), «У бітве вялікай» (1957), «Калі ты чалавек» (1961) і інш.

Творы драматурга адлюстроўваюць гераічныя падзеі гісторыі краіны, раскрываюць духоўны свет чалавека. П'есы ставіліся амаль ва ўсіх драматычных тэатрах Беларусі і за мяжой; перакладаліся на іншыя мовы.

А. Маўзон – аўтар зборнікаў: «Выбраныя п'есы» (1964), «Людзі і час» (1972), «П'есы» (1974, 1978), «Да апошняга дыхання» (1985). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Памёр А. Маўзон 19 жніўня 1977 г., пахаваны ў Мінску на Паўночных могілках.

Яго імя носіць вуліца ў Віцебску.

4 сакавіка	– 55 гадоў	таму (1958) нарадзіўся Баршчэўскі Лявон (сапр. Леанід Пятровіч), паэт, перакладчык, крытык, ураджэнец г. Полацка.
7 сакавіка	– 260 гадоў	таму (1753) нарадзіўся Ваўжэцкі Тамаш (1753–1816), адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 г., ураджэнец Браслаўскага раёна.
7 сакавіка	– 95 гадоў	таму (1918) нарадзіўся Іваноўскі Яўген Піліпавіч (1918–1991), военачальнік, генерал арміі, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Чарэя Чашніцкага раёна.
7 сакавіка	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Базыленка Аляксандр Васільевіч, беларускі спартсмен і трэнер (лёгкая атлетыка, спартыўная хадзьба), заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь, майстар спорту СССР міжнароднага класа, ураджэнец г. Віцебска.
7 сакавіка	– 70 гадоў	таму (1943) прысвоена званне Героя Савецкага Саюза Заслонаву Канстанціну Сяргеевічу (1910–1942), аднаму з арганізатараў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на Віцебшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
10 сакавіка	– 90 гадоў	таму (1923) нарадзіўся Полазаў Мікалай Нічыпаравіч (1923–1994), партыйны і прафсаюзны дзеяч, ураджэнец в. Забалоцце Ушацкага раёна.
10 сакавіка	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзілася Ганчарова Роза (Ружа) Іосіфаўна, вучоны ў вобласці генетыкі, ураджэнка г. Оршы.
11 сакавіка	– 110 гадоў	таму (1903) нарадзіўся Кляшторны Тодар Тодаравіч (1903–1937), беларускі паэт, ураджэнец в. Парэчча Лепельскага раёна.
12 сакавіка	– 145 гадоў	таму (1868) нарадзіўся Лепяшынскі Панцеляймон Мікалаевіч (1868–1944), рэвалюцыянер, публіцыст, педагог. З 1906 г. па 1910 г. жыў у г. Оршы.
14 сакавіка	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Цішачкін Мікалай Пятровіч (1938–1993), акцёр тэатра імя Я. Коласа, заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

17 сакавіка	– 95 гадоў	таму (1918) нарадзіўся Лефеўр Марсель (1918–1944), Герой Савецкага Саюза, заслужаны лётчык Францыі, удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці.
17 сакавіка	– 80 гадоў	таму (1933) нарадзіўся Смялкоўскі Леанід Аляксандравіч (1933–1995), дамрыст, дырыжор, кампазітар, ураджэнец в. Радунь Лепельскага раёна.
18 сакавіка	– 65 гадоў	таму (1948) нарадзіўся Шышкевіч Аляксандр Міхайлавіч, краязнавец Аршанскага раёна.
23 сакавіка	– 65 гадоў	таму (1948) нарадзіўся Пашкоў Генадзь Пятровіч, паэт, публіцыст, ураджэнец в. Ліпавічы Чашніцкага раёна.
23 сакавіка	– 40 гадоў	таму (1973) нарадзілася Пішчэйка Вера Маратаўна, беларуская спартсменка (скачкі на батуце), майстар спорту СССР, майстар спорту Беларусі міжнароднага класа, прызёр чэмпіяната Еўропы, ураджэнка г. Віцебска.
24 сакавіка	– 105 гадоў	таму (1908) нарадзіўся Глебаў Аляксей Канстанцінавіч (1908–1968), скульптар, народны мастак Беларусі, адзін з арганізатараў Асацыяцыі мастакоў рэвалюцыі ў Віцебску (1928–1930 гг.).
25 сакавіка	– 90 гадоў	таму (1923) нарадзіўся Карыкаў Парфірый Герасімавіч (1923–2003), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы. З 1998 г. жыў у г. Віцебску.
26 сакавіка	– 80 гадоў	таму (1933) нарадзіўся Клубовіч Уладзімір Уладзіміравіч, беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі апрацоўкі металаў, акадэмік НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, былы дырэктар Віцебскага аддзялення Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН Беларусі.
27 сакавіка	– 90 гадоў	таму (1923) нарадзіўся Рылько Алесь (сапр. Аляксей Іванавіч (1923–1967), пісьменнік, ураджэнец в. Рыдамля Талачынскага раёна.
27 сакавіка	– 60 гадоў	таму (1953) заснаваны калгас імя М.В. Фрунзе Шаркаўшчынскага раёна. Зараз СПК "Каўшалёва".

ЛІТАРАТУРА:

1. **Бунто, Я.** Жыццё і творчасць Т. Даленгі-Мастовіча / Я. Бунто // Веснік Глыбоччыны. — 1998. — 5 жн. — С. 2.

2. **Зотаў, Г.** Адысея Тадэвуша Мастовіча / Г. Зотаў // Віцебскі рабочы. — 2001. — 7 крас. — С. 3.

3. **Нікалаева, С.** Памяці слыннага земляка / С. Нікалаева // Веснік Глыбоччыны. — 1998. — 14 кастр. — С. 1.

4. **Тадэвуш** Даленга-Мастовіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. А. М. Хількевіч. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. — С. 167—168.

5. **Хайноўская, А.** Аўтар «Знахара» – з Глыбоччыны / А. Хайноўская // Веснік Глыбоччыны. — 2012. — 1 верас. — С. 4.

ВЕРАСЕНЬ

МАЎЗОН АРКАДЗЬ

(сапраўднае імя Маўшэнзон Арон Іосіфавіч)

Да 95-годдзя з дня нараджэння (1918)

Аркадзь Маўзон нарадзіўся 23 верасня 1918 года ў горадзе Віцебску ў сям’і рабочага. Бацька, Іосіф Аронавіч, працаваў на заводзе

З 1922 года жыў у Варшаве. Першыя гады пасля вайсковай службы для маладога гуманіста з незакончанай вышэйшай адукацыяй былі вельмі складанымі. Жыў у цесных умовах, шукаючы выпадковых заробкаў. Аднак з 1924 года стаў супрацоўнікам , а потым рэдактарам газеты «Rzeczpospolita». З 1925 года на старонках гэтай газеты з'яўляюцца артыкулы і фельетоны, падпісаныя псеўданімам «Т. М.». У тым жа годзе друкуюцца і першыя апавяданні маладога аўтара. У 1926 годзе ён пісаў ужо пад новым псеўданімам – Даленга. У гэты час пачынаецца яго кар'ера як журналіста , фельетаніста , пісьменніка.

Яго вострыя палітычныя фельетоны ў афіцыйнай дзяржаўнай прэсе былі напісаны пра тое, што ён бачыў сваімі вачыма ў тагачасным жыцці і меў свае меркаванні і ацэнку. Канчаткова працу ў газеце ён пакідае ў 1928 годзе і становіцца незалежным пісьменнікам.

Вялікія творы Тадэвуш Даленга-Мастовіч пачаў пісаць у 1924 годзе. У 1929 годзе ён падрыхтаваў да друку аповесць «Апошнія брыгады», у якой крытыкаваліся звычкі польскіх абываценяў 1920-х гадоў. У 1931 годзе была надрукавана аповесць «Чэкі без аплаты». Але найбольшую вядомасць прынесла аўтару публікацыя рамана «Кар’ера Нікадыма Дызмы» (1932) – вострай сатыры на грамадска-палітычнае жыццё буржуазнай Польшчы. Т. Даленга-Мастовіч – аўтар раманаў «Пракурор Аліцыя Горн» (1933), «Свет пані Маліноўскай» (1934), «Знахар» (1937) і інш.

У 1934 годзе пачынаецца супрацоўніцтва пісьменніка з кінематографам. Да 1939 года з 16 твораў Даленгі-Мастовіча было экранізавана 8 («Іх дзіця», «Тры сэрцы», «Прафесар Вільчур» і іншыя). Апошняя аповесць «Дзённік пані Ганкі» з’явілася ў 1939 годзе.

Калі пачалася Другая сусветная вайна, пісьменнік зноў апынуўся на фронце. Ён трагічна загінуў у верасні 1939 года паблізу румынскай граніцы. У 1978 годзе яго астанкі перапахаваны ў Варшаве на Павянзковых могілках. Творчасць Т. Даленгі-Мастовіча па-ранейшаму папулярная не толькі ў Польшчы, але і ў іншых краінах.

27 сакавіка – 55 гадоў таму (1958) нарадзілася Белашапка (Івінская) Таццяна Міхайлаўна, беларуская спартсменка (баскетбол), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў, чэмпіёнка свету, ураджэнка г. Віцебска.

28 сакавіка – 130 гадоў таму (1883) нарадзіўся Керзін Міхаіл Аркадзевіч (1883–1979), скульптар, педагог, выкладчык Віцебскага мастацкага тэхнікума (1923–1932 гг.).

30 сакавіка – 60 гадоў таму (1953) нарадзіўся Маслюк Валерый Васільевіч (1953–2001), рэжысёр, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец в. Ропна Полацкага раёна.

31 сакавіка – 70 гадоў таму (1943) створаны 377-мы гвардзейскі зенітны ракетны полк. Дыслацыруецца ў г. Полацку.

31 сакавіка – 35 гадоў таму (1978) выпусціў першую прадукцыю Наваполацкі завод бялкова-вітамінных канцэнтратаў.

КРАСАВІК

45 гадоў таму (1968) заснаваны Бягомльскі музей народнай славы. Адкрыты ў маі 1970 г.

1 красавіка – 100 гадоў таму (1913) нарадзіўся Папкоўскі Леанід Аляксандравіч (1913–1988), адзін з кіраўнікоў падполля на Расоншчыне ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец Расонскага раёна.

1 красавіка – 30 гадоў таму (1983) адкрыўся рух самалётаў ТУ-134 праз Віцебскі аэрапорт на Свярдлоўск, Калінінград.

1 красавіка – 20 гадоў таму (1993) створана Віцебская мытня.

2 красавіка – 80 гадоў таму (1933) нарадзілася Белая (па мужу Бурсава) Лізавета Якаўлеўна, беларуская спартсменка (стральба кулявая), майстар спорту СССР, чэмпіёнка СССР, ураджэнка г. Віцебска.

4 красавіка	– 105 гадоў	таму (1908) нарадзілася Базыленка Ганна Мартынаўна (1908–1980), беларускі мовазвавец, кандыдат філалагічных навук, ураджэнка г.п. Арэхаўск Аршанскага раёна.
4 красавіка	– 80 гадоў	таму (1933) нарадзілася Наумава Лідзія Андрэеўна, Герой Сацыялістычнай Працы, былая старшыня калгаса "Перамога" Талачынскага раёна.
5 красавіка	– 95 гадоў	таму (1918) нарадзіўся Герасіменка Пракоп Міхайлавіч (1918–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення г. Віцебска. Загінуў у баях пад Віцебскам.
7 красавіка	– 70 гадоў	таму (1943) быў створаны Віцебскі падпольны гарком КПБ.
10 красавіка	– 85 гадоў	таму (1928) нарадзілася Кубліцкая Раіса Уладзіміраўна, Герой Сацыялістычнай Працы, работніца калгаса імя Камінтэрна Лёзненскага раёна, ураджэнка в. Калышкі Лёзненскага раёна.
11 красавіка	– 65 гадоў	таму (1948) нарадзілася Касоўская Ірына Яўгенаўна, краязнаўца Аршанскага раёна.
13 красавіка	– 80 гадоў	таму (1933) нарадзіўся Кальцоў Віталь Аляксандравіч (1933–2007), рэдактар раённай газеты "Чырвоны прамень", ураджэнец в. Хвашчы Чашніцкага раёна.
15 красавіка	– 100 гадоў	таму (1913) нарадзіўся Прудзікаў Міхаіл Сідаравіч (1913–1995), Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр, камандзір партызанскай брыгады "Няўлоўныя", якая дзейнічала ў Полацкім раёне.
17 красавіка	– 60 гадоў	таму (1953) нарадзіўся Драба Уладзімір Нікандравіч, беларускі вандроўнік-палярнік, удзельнік і кіраўнік больш за 50 арктычных і антарктычных экспедыцый, ураджэнец в. Астрова Міёрскага раёна.
20 красавіка	– 105 гадоў	таму (1908) нарадзіўся Шур Якаў Шэбселевіч (1908–1986), расійскі вучоны-фізік, адзін са стваральнікаў уральскай навуковай школы магнітолагаў, ураджэнец г. Дуброўна.
22 красавіка	– 215 гадоў	таму (1798) пачата брукоўка віцебскіх вуліц.

Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1984. — С. 253.

4. **Долготович, Б. Д.** Богатырев Анатолий Васильевич / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов : биографический справочник / Б. Д. Долготович. — Мн. : Беларусь, 2008. — С. 55.

5. **Хадоска, А.** Для мяне ён дагэтуль – загадка... / А. Хадоска // Літаратура і мастацтва. — 2003. — 1 жн. — С. 10—11.

ТАДЭВУШ ДАЛЕНГА-МАСТОВІЧ

Да 115-годдзя з дня нараджэння (1898)

Нарадзіўся будучы пісьменнік 10 жніўня 1898 года на Глыбоччыне (маёнтак Акунёва Пліскай воласці). Яго бацька Стэфан працаваў юрыстам, а маці Станіслава (з роду Патаповічаў) была хатняй гаспадыняй, займалася выхаваннем дзяцей. Іх маёнтак быў адным з лепшых у акрузе. Потым сям'я пераехала ў Глыбокае.

Пачатковую адукацыю Тадэвуш атрымаў дома, затым паступіў у Віленскую гімназію, якую скончыў у 1915 годзе. У час далейшага навучання ў Кіеўскім універсітэце быў членам польскай вайсковай арганізацыі. У 1919 годзе добраахвотнікам пайшоў у польскую армію, у якой знаходзіўся да 1922 года.

мастацтва, ён працягваў традыцыі класічнай музыкі, і перш за ўсё рускай. У той жа час музыка А. Багатырова арганічна ўпісваецца ў шэраг тых мастацкіх з'яў, якія прадоўжылі рамантычную лінію ў мастацтве. Блізкасць да гэтай плыні выяўляецца як ў экспрэсіі, асобнай выразнасці музыкі, так і ў звароце да вобразаў прыроды, чыё дыханне адчуваецца ў драматычных кантатах «Беларускім партызанам», «Ленінградцы», араторыі «Бітва за Беларусь», у операх. Малюнкі прыроды заўсёды эмацыянальна сугучны сюжэту, дзеянню, душэўнаму стану герояў, яны служаць кантрастам напружанаму развіццю або ствараюць фон, які садзейнічае рэльефнасці вобразаў. Прырода з'яўляецца адным з галоўных герояў яго кантат «Беларускія песні», «Малюнкі роднага краю», лірычных тэм сімфоній, канцэртаў, а таксама хораў і рамансаў.

Мастацтва А. Багатырова з'явілася імпульсам для многіх напрамкаў і абумовіла шмат стылявых пластоў сучаснай беларускай музыкі. Яго оперы, кантаты, араторыя і хоры складаюць фундамент музычнай культуры Беларусь. Узнагароды: Сталінская прэмія другой ступені (1941) – за оперу «У пушчах Палесся» (1939); Дзяржаўная прэмія БССР; ордэн Францыска Скарыны; ордэн Леніна; 3 ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга; ордэн «Знак Пашаны»; ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі; ордэн Дружбы народаў; медаль Францыска Скарыны і інш.

А. В. Багатыроў памёр 19 верасня 2003 года. Пахаваны ў Мінску на Усходніх могілках.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Анатоль** Васільевіч Багатыроў (1913—2003) : этапы лёсу // Полымя. — 2008. — № 12. — С. 99.

2. **Багатыроў** Анатоль Васільевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 1996. — Т. 2. — С. 201.

3. Багатыроў Анатоль Васільевіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. —

23 красавіка – 100 гадоў таму (1913) нарадзіўся Рэлес Рыгор Львовіч (1913–2004), паэт, празаік, ураджэнец г. Чашнікі.

24 красавіка – 365 гадоў таму (1648) Кароль Польскі і Вялікі Князь Літоўскі Уладзіслаў IV Ваза сваёй граматай дазволіў заснаваць у Оршы праваслаўнае брацтва.

24 красавіка – 110 гадоў таму (1903) нарадзіўся Мацкевіч Леў Пятровіч (1903–1968), беларускі архітэктар, ураджэнец г. Оршы.

26 красавіка – 65 гадоў таму (1948) выраблены першы дыван на Віцебскім дывановым камбінаце.

27 красавіка – 135 гадоў таму (1878) нарадзіўся Любіч-Маеўскі Станіслаў Адамавіч (1878–1941), грамадскі і культурны дзеяч, педагог, ураджэнец Полацкага раёна.

МАЙ

85 гадоў таму (1928) ў в. Малое Грачушына створаны калгас "1-е Мая".

25 гадоў таму (1988) каля в. Альбрэхтава пушчана ў строй устаноўка па вырабу асфальту.

1 мая – 90 гадоў таму (1923) нарадзіўся Жукаў Сцяпан Іванавіч (1923–1997), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, лётчык-штурмавік, ураджэнец в. Пірагі Расонскага раёна.

1 мая – 90 гадоў таму (1923) нарадзіўся Шабашоў Сяргей Міхайлавіч (1923–2007), партыйны дзеяч Беларусі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, грамадскі дзеяч, Ганаровы грамадзянін г. Віцебска, ураджэнец в. Драгуны Лёзненскага раёна.

1 мая – 85 гадоў таму (1928) нарадзіўся Захарчэня Барыс Пятровіч (1928–2005), расійскі фізік, акадэмік РАН, лаўрэат Ленінскай прэміі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнец г. Оршы.

1 мая – 80 гадоў таму (1933) нарадзілася Андрэева Наталля Яўгеньеўна, урач, прафесар, доктар медыцынскіх навук, ураджэнка г. Оршы.

2 мая – 125 гадоў таму (1888) нарадзіўся Віткоўскі Іван Антонавіч (1888–1937), беларускі гісторык, педагог, прафесар, ураджэнец в. Чэрчыцы Шумілінскага раёна.

2 мая – 120 гадоў таму (1893) нарадзіўся Бяссмертны Аркадзь Львовіч (1893–1955), скрыпач, дырыжор, педагог, заслужаны артыст Беларусі, прафесар, адзін з арганізатараў першай на Беларусі Віцебскай народнай кансерваторыі.

3 мая – 60 гадоў таму (1953) нарадзіўся Сіўко Франц Іванавіч, беларускі пісьменнік, публіцыст, ураджэнец в. Вята Міёрскага раёна.

4 мая – 150 гадоў таму (1863) нарадзіўся Нарбут Станіслаў (1853–1926), урач. Жыў у Браславе, дзе на ўласныя сродкі збудаваў бальніцу.

4 мая – 130 гадоў таму (1883) нарадзіўся Малько Мікалай Андрэевіч (1883–1961), расійскі дырыжор, педагог. Узначальваў Віцебскую народную кансерваторыю і сімфанічны аркестр (1918–1921 гг.).

4 мая – 70 гадоў таму (1943) ў гэты і наступны дзень савецкая авіяцыя далёкага дзеяння зрабіла масіраваны налёт на чыгуначную станцыю Орша. У налёце ўдзельнічалі 180–230 бамбардзіроўшчыкаў. Сігналы падавалі аршанскія падпольшчыкі.

5 мая – 95 гадоў таму (1918) ў Віцебску створаны Губернскі Савет народнай гаспадаркі.

6 мая – 80 гадоў таму (1933) нарадзіўся Свірка Юрась (сапр. Юрый Мікалаевіч (1933–2004), беларускі паэт, ураджэнец в. Маргавіца Докшыцкага раёна.

8 мая – 80 гадоў таму (1933) нарадзілася Давыдзенка Ніна Сцяпанаўна, артыстка балета, народная артыстка БССР, ураджэнка г. Віцебска.

9 мая – 95 гадоў таму (1918) быў арганізаваны першы ваенны камісарыят г. Віцебска для стварэння часцей рэгулярнай Чырвонай Арміі.

ЖНІВЕНЬ

БАГАТЫРОЎ

АНАТОЛЬ ВАСІЛЬЕВІЧ

Да 100-годдзя з дня нараджэння (1913)

Анатоль Васільевіч Багатыроў нарадзіўся 13 жніўня 1913 года ў Віцебску. Беларускі савецкі кампазітар, педагог, грамадскі дзеяч, ён на працягу ўсяго свайго жыцця прымаў актыўны ўдзел у развіцці прафесійнага музычнага мастацтва.

Член Саюза кампазітараў Беларусі (1933). Заслужаны артыст Беларусі (1940). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1941). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1944). Прафесар (1960). Народны артыст Беларусі (1968). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1969). Ганаровы член Міжнароднай Славянскай Акадэміі навук, адукацыі, мастацтваў, культуры (1995).

Закончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класе кампазіцыі прафесара В. А. Залатарова (1937). З 1948 года – выкладчык Беларускай акадэміі музыкі , у 1948–1962 гады – яе рэктар. У 1938-1949 гадах – старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1938-1959). Заснавальнік беларускай нацыянальнай кампазітарскай школы.

Творчасць А. Багатырова ахоплівае оперу, сімфонію, хор, араторыю, канцэрт і жанры невялікай формы. Іх вызначае актуальнасць тэматыкі, аптымістычнасць канцэпцый, яркасць вобразных характарыстык. А. Багатыроў з’яўляўся прадстаўніком рэалістычнага

1920-я гады. Ён працаваў загадчыкам музеяў В. Федаровіча і інстытута народнай адукацыі, навуковым супрацоўнікам і намеснікам дырэктара гістарычнага музея. У. Краснянскі разабраў і сістэматызаваў нацыяналізаваную музейную калекцыю В. П. Федаровіча. Ён займаўся апісаннем і складаннем сістэматычных каталогаў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі і царкоўна-археалагічнага музея. У сярэдзіне 1920-х гадоў краязнавец надрукаваў некалькі цікавых даследаванняў: «Музейные памятники древних ремесленных организаций», «История музейного строительства в Витебске и современное его состояние», «Книга привилегий города Витебска», «Батлейка Витебского отделения Белорусского государственного музея».

Памёр выдатны гісторык і даследчык 4 мая 1930 года. У 1996 годзе ў Віцебску, на будынку, дзе ў 1911–1919 гадах жыў У. Г. Краснянскі, была ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Краснянскі** Уладзімір Гаўрылавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1997. — Т. 4. — С. 252.

2. **Краснянскі** Уладзімір Гаўрылавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. — Т. 3. — С. 122.

3. **Подлипский, А. М**. Краевед Владимир Краснянский (1863—1930) / А. М. Подлипский. — Витебск : Витеб. обл. тип., 1997. — 29 с.

9 мая – 45 гадоў таму (1968) ў Віцебску ўстаноўлены помнік героям Віцебскага падполля.

10 мая – 95 гадоў таму (1918) ў Віцебску адкрыўся II губернскі з’езд Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

10 мая – 85 гадоў таму (1928) адбыўся IV з’езд прафсаюзаў Віцебшчыны.

10 мая – 80 гадоў таму (1933) нарадзіўся Вітко Уладзімір Ільіч, беларускі мастак, жывапісец. Жыве і працуе ў Віцебску.

12 мая – 40 гадоў таму (1973) нарадзіўся Шапавалаў Вячаслаў Валер'евіч, беларускі спартсмен (ушу), майстар спорту міжнароднага класса, прызёр чэмпіянату свету, ураджэнец г. Віцебска.

15 мая – 130 гадоў таму (1883) нарадзіўся Буевіч Іосіф Іванавіч (1883–1964), рэвалюцыянер. Са жніўня 1917 г. да канца 20-х гадоў на розных пасадах у Оршы, Сянне і інш.

15 мая – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Котчанка Фёдар Пятровіч (1918–1995), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Смакава Віцебскага раёна.

16 мая – 95 гадоў таму (1918) пры Віцебскім акружным народным судзе створана камісія па справах непаўналетніх.

16 мая – 90 гадоў таму (1923) адкрыты нафтасклад (з 1934 г. нафтабаза) у г. Віцебску.

17 мая – 105 гадоў таму (1908) нарадзіўся Сурын Марцін Акімавіч (1908–1963), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Руднае Чашніцкага раёна.

20 мая – 115 гадоў таму (1898) нарадзіўся Шапіра Тэвель Маркавіч (1898–1983), жывапісец і дойлід, ураджэнец мястэчка Смаляны пад Віцебскам.

20 мая – 90 гадоў таму (1923) нарадзіўся Сталяроў Іван Міхайлавіч, мастак, педагог, ураджэнец г. Віцебска.

20 мая – 90 гадоў таму (1923) нарадзіўся Свідзінскі Уладзімір Іванавіч (1923–1945), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Віцебска.

21 мая	– 105 гадоў	таму (1908) нарадзіўся Даўгяла Міхаіл Хрысанавіч (1908–1978), жывапісец, ураджэнец в. Крутое Гарадоцкага раёна.
21 мая	– 95 гадоў	таму (1918) створаны Віцебскі губернскі аддзел народнай адукацыі.
22 мая	– 30 гадоў	таму (1983) нарадзіўся Зуеў Віктар Валер'евіч, беларускі спартсмен (бокс), майстар спорту Беларусі міжнароднага класа, прызёр Алімпійскіх гульняў, прызёр чэмпіянату свету і чэмпіянатаў Еўропы.
23 мая	– 90 гадоў	таму (1923) адбыўся V з'езд работнікаў мастацтва Віцебскай губерні.
26 мая	– 110 гадоў	таму (1903) нарадзіўся Пятроў Георгій Сяргеевіч (1903–1989), адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
28 мая	– 55 гадоў	таму (1958) створана Полацкая міжраённая будаўнічая арганізацыя. Зараз будаўнічае рэспубліканскае прадпрыемства "ПМК-59".
28 мая	– 30 гадоў	таму (1983) адкрыты мемарыяльны пакой-музей П.М. Машэрава ў Віцебскім дзяржаўным інстытуце імя С.М. Кірава. Зараз – ВДУ імя П.М. Машэрава.
29 мая	– 90 гадоў	таму (1923) нарадзіўся Тышэвіч Уладзімір Аляксандравіч (1923–1980), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, лётчык-штурмавік, палкоўнік, ураджэнец г. Віцебска.
30 мая	– 85 гадоў	таму (1928) пачалі ствараццa на Віцебшчыне зберагальныя касы.

ўстанову ў 1886 годзе і працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Беластоцкім рэальным вучылішчы. Праз чатыры гады пад кіраўніцтвам вядомага археолага і калекцыянера М. Авенарыуса пачаў краязнаўчую дзейнасць – прыняў удзел у раскопках курганоў на Магілёўшчыне.

З 1896 па 1903 год выкладаў гісторыю і геаграфію ў Мінскай мужчынскай гімназіі. Вынікам навуковай дзейнасці Краснянскага ў гэты час стала першае даследаванне – «Минский департамент Великого княжества Литовского (эпизод из истории войны 1812 г.)». Яно было надрукавана ў 1902 годзе. У гэты ж час Уладзімір Гаўрылавіч падрыхтаваў і некалькі пазней надрукаваў яшчэ дзве працы: «Минская гимназия в 1861–1885 годах» і «Город Борисов и Борисовский уезд в Отечественную войну 1812 года».

У 1903 годзе Краснянскі пакінуў Мінск і пераехаў у Вільню, дзе яго прызначылі памочнікам архіварыуса Цэнтральнага архіва старажытных актаў. З красавіка 1903 г. Уладзімір Гаўрылавіч ужо кіраваў канцылярыяй Віленскай навучальнай акругі. На гэтай пасадзе ён працаваў тры з паловай гады.

У кастрычніку 1906 года ён заняў пасаду дырэктара Мсціслаўскай гімназіі на Магілёўшчыне. За пяць гадоў знаходжання ў гэтым горадзе Уладзімір Гаўрылавіч не толькі ўнёс значны ўклад у работу навучальнай установы, але і займаўся вывучэннем мясцовай даўніны. Ён падрыхтаваў і выдаў у 1912 годзе кнігу «Город Мстиславль (Могилевской губернии)», якая з'яўляецца адной з самых значных яго работ.

У 1911 г. У. Г. Краснянскі пераехаў у Віцебск. Працаваў дырэктарам рэальнага вучылішча, лектарам і выкладчыкам у навучальных установах. На працягу амаль двух дзесяцігоддзяў жыцця ў Віцебску У. Краснянскі займаўся не толькі педагагічнай працай, але і вывучэннем мінулага горада. Быў членам Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (1911–1918), камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва (1919–1924), акруговага таварыства краязнаўства (1924–1927).

Трэба адзначыць яго вялікі ўклад у стварэнне музеяў г. Віцебска ў

ЛІТАРАТУРА:

1. **Віцебскі** трамвай // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 1997. — Т. 4. — С. 232.

2. **Музей** истории Витебского трамвая : [буклет] / отв. за вып. А. Фрумин. — Витебск : УКТП «Витеб. трамв.-трол. упр.», 2008. — 18 с.

3. **Павлючков, В. М.** Витебский трамвай : документы и материалы / В. М. Павлючков. — Мн. : Парадокс, 2012. — 412 с.

4. **Павлючков, В. М.** Витебский трамвай : исторический очерк / В. М. Павлючков. — Мн. : Медисонт, 2010. — 240 с.

ЛІПЕНЬ

КРАСНЯНСКІ

УЛАДЗІМІР ГАЎРЫЛАВІЧ

Да 150-годдзя з дня нараджэння (1863)

Краснянскі Уладзімір Гаўрылавіч – педагог, беларускі гісторык, музейны работнік і краязнавец. Нарадзіўся 9 (21) ліпеня 1863 г. у с. Руціна Валдайскага павета Наўгародскай губерніі ў сям'і святара. Пасля заканчэння гімназіі паступіў на гісторыка-геаграфічнае аддзяленне Пецярбургскага гісторыка-філалагічнага інстытута. Скончыў навучальную

ЧЭРВЕНЬ

1 чэрвеня – 90 гадоў таму (1923) ў Віцебску быў створаны першы піянерскі атрад.

1 чэрвеня – 85 гадоў таму (1928) было пачата будаўніцтва першага ў БССР Аршанскага мясакамбіната. Уведзены ў строй у 1932 г.

1 чэрвеня – 70 гадоў таму (1943) нарадзіўся Майсяёнак Андрэй Георгіевіч, медык, краязнавец, грамадскі дзеяч, член-карэспандэнт НАН Беларусі, ураджэнец г. Глыбокае.

3 чэрвеня – 90 гадоў таму (1923) адкрыты палітыка-асветніцкі сад імя У.І. Леніна. Зараз парк імя У.І. Леніна.

3 чэрвеня – 60 гадоў таму (1953) нарадзілася Кірпічонак Людміла Мікалаеўна, беларускі вучоны ў галіне біяхіміі. Працуе ў ВДМУ і Віцебскім філіяле НДІ радыяцыйнай медыцыны.

5 чэрвеня – 840 гадоў таму (1173) памерла Еўфрасіння Полацкая.

7 чэрвеня – 55 гадоў таму (1958) пачалося будаўніцтва г. Наваполацка і нафтаперапрацоўчага завода.

7 чэрвеня – 50 гадоў таму (1963) нарадзіўся Далінін Яўген Мікалаевіч, спартсмен (дзюдо, самба, самаабарона), майстар спорту СССР міжнароднага класа, чэмпіён Еўропы і прызёр чэмпіянату свету, ураджэнец Оршы.

10 чэрвеня – 90 гадоў таму (1923) адбылося ўрачыстае адкрыццё механічнай абутковай фабрыкі імя Леккерта. Зараз фабрыка "Чырвоны Кастрычнік".

11 чэрвеня – 85 гадоў таму (1928) нарадзіўся Філіповіч Мікалай Яўстафавіч (1928–2000), беларускі вучоны ў галіне хірургіі, ганаровы акадэмік Беларускай акадэміі медыцынскіх навук, заслужаны ўрач Беларусі, ураджэнец в. Жмакіна Шумілінскага раёна.

14 чэрвеня – 135 гадоў таму (1878) нарадзіўся Багародскі Мікалай Мікалаевіч (1878–1938), гісторык, краязнавец Віцебшчыны.

14 чэрвеня – 115 гадоў таму (1898) нарадзіўся Пруслін Навум Маркавіч (1898–1937), палітычны дзеяч, ураджэнец г. Лепеля.

14 чэрвеня – 95 гадоў таму (1918) ў Віцебску заснаваны абласны краязнаўчы музей.

15 чэрвеня – 40 гадоў таму (1973) Аршанскі тэкстыльны тэхнікум перайменаваны ў механіка-тэхналагічны.

18 чэрвеня – 135 гадоў таму (1878) нарадзіўся Махноў Фёдар (1878–1913), самы высокі чалавек на зямлі, ураджэнец Віцебскага раёна.

18 чэрвеня – 115 гадоў таму (1898) ў Віцебску адбыўся пуск першага электрычнага трамвая.

18 чэрвеня – 90 гадоў таму (1923) нарадзіўся Гальданскі Віталій Іосіфавіч (1923–2001), вучоны ў вобласці хімічнай і ядзернай фізікі, акадэмік АН СССР, ураджэнец г. Віцебска.

19 чэрвеня – 115 гадоў таму (1898) нарадзіўся Савіцкі Маркел Сцяпанавіч (1898–1975), вучоны ў галіне раслінаводства, доктар сельскагаспадарчых навук, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, ураджэнец Дубровенскага раёна.

19 чэрвеня – 70 гадоў таму (1943) нарадзіўся Багацікаў Георгій Васільевіч, вучоны-вірусолаг, доктар біялагічных навук, ураджэнец г. Лепеля.

20 чэрвеня – 75 гадоў таму (1938) нарадзіўся Аўласевіч Міхаіл Аляксандравіч, беларускі мовазнавец, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, дзяржаўны дзеяч, ураджэнец в. Станіславова Шаркаўшчынскага раёна.

25 чэрвеня – 85 гадоў таму (1928) ў г.п. Арэхаўск Аршанскага раёна адбыўся I з'езд Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

27 чэрвеня – 130 гадоў таму (1883) ў Віцебску было заснавана Таварыства аматараў музычнага і драматычнага мастацтва. Існавала да 1887 г.

быў заключаны дагавор аб будаўніцтве ў Віцебску электрычнай чыгункі (трамвая). Дагавор прадугледжваў перадачу канцэсіі на будаўніцтва і эксплуатацыю трамвая ў Віцебску Гільёну тэрмінам на 40 гадоў. Гільён павінен быў пабудаваць трамвай за ўласны кошт, а пры яго эксплуатацыі выплочваць у гарадскую казну з кожнага дзеючага вагона ў першае дзесяцігоддзе па 30 рублёў, у другое – па 40 рублёў, у кожнае наступнае дзесяцігоддзе – па 50 рублёў. Пры падпісанні дагавора Ф. Гільён аддаў віцебскім уладам заклад у памеры 10000 рублёў.

Будаўніцтва трамвайных ліній вялося пад кіраўніцтвам інжынера І. С. Розенталя , прадстаўніка Ф. Гільёна. З верасня 1896 да чэрвеня 1898 года былі пабудаваны чатыры ўчасткі трамвайных ліній і збудаванняў працягласцю звыш 6 кіламетраў. Электрычную энергію для трамвая выпрацоўвала цэнтральная станцыя, якая размяшчалася на Задуноўскай вуліцы побач з Мікалаеўскай саборнай плошчай. З-за мяжы у Віцебск былі дастаўлены 18 маторных вагонаў і 16 летніх прычапных вагонаў. Маторны вагон налічваў 32 месцы, а прычапны быў разлічаны на 28 месцаў.

18 чэрвеня 1898 года па вуліцах Віцебска ўпершыню пайшлі трамваі. Для невялікага губернскага горада гэта было значнай падзеяй. Мясцовы кампазітар О. Ф. Крамер напісаў «Трамвайны марш» з нагоды адкрыцця трамвайнага руху. Віцебск стаў адным з першых гарадоў тагачаснай Расіі, дзе на рубяжы XIX і XX стагоддзяў быў пушчаны гарадскі электрычны транспарт.

У цяперашні час перавозкі пасажыраў ажыццяўляюцца па дзевяці трамвайных маршрутах працягласцю звыш 200 кіламетраў. Колькасць трамваяў – 97 адзінак. Штодзённая перавозка складае 110 тысяч пасажыраў. У 1966 годзе быў створаны музей гісторыі Віцебскага трамвая. Першы ў Беларусі галіновы музей размешчаны ў трамвайным дэпо. У чатырох залах музея, якому ў 2002 годзе прысвоена званне «народны», адлюстраваны ўсе этапы станаўлення і развіцця легендарнага трамвая, які ўжо другое стагоддзе служыць гараджанам і гасцям Віцебска.

ЧЭРВЕНЬ

ВІЦЕБСКІ ТРАМВАЙ

Да 115-годдзя з дня пуску (1898)

Упершыню пытанне аб будаўніцтве ў Віцебску электрычнага трамвая было ўзнята 10 ліпеня 1895 г., калі ганаровы грамадзянін горада Кіева Ляонцій Фельдзер падаў Віцебскай гарадской управе заяву з просьбай даць яму канцэсію на будаўніцтва і эксплуатацыю ў горадзе на працягу 50 гадоў «конна-электрычнай чыгункі». Праз два з паловай месяцы, 25 верасня, у гарадскую ўправу было пададзена падобнае прашэнне ад грамадзяніна Францыі Фернана Гільёна. Гільён падаў гарадскім уладам праект дамовы аб канцэсіі на будаўніцтва трамвая тэрмінам на 45 гадоў. 27 верасня была пададзена трэцяя заява ад прадстаўніка Бельгійскай кампаніі ў Бруселі Пятра Вільмена.

15 лістапада 1895 года ў Віцебскай гарадской думе прайшло пасяджэнне пад старшынствам гарадскога галавы І. С. Канюшэўскага. На ім разглядалася пытанне «Пра жаданне некаторых устроіць у горадзе Віцебску конна-жалезную дарогу». Пасля абмеркавання ўсіх трох заяў было праведзена галасаванне. Перамагла прапанова Фернана Гільёна, за якую прагаласавалі 23 з 24 удзельнікаў пасяджэння.

4 лютага 1896 г. паміж Фернанам Гільёнам і Віцебскай управай

ЛІПЕНЬ

35 гадоў таму (1978) Пятру Міронавічу Машэраву (1918–1980) прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

25 гадоў таму (1988) здадзены ў эксплуатацыю Летні амфітэатр.

1 ліпеня – 110 гадоў таму (1903) ў Оршы была адкрыта Аляксееўская жаночая гімназія. Ліквідавана ў 1918 г.

1 ліпеня – 105 гадоў таму (1908) нарадзілася Воранава Аляксандра Іванаўна (1908–1978), беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнка г. Віцебска.

1 ліпеня – 75 гадоў таму (1938) нарадзіўся Агароднікаў Мікалай Пракопавіч, дзеяч культуры, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец Дубровенскага раёна.

1 ліпеня – 50 гадоў таму (1963) нарадзіўся Жалязоўскі Ігар Мікалаевіч, беларускі спартсмен (скорасны бег на каньках), заслужаны майстар спорту Беларусі, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Рэспублікі Беларусь, прызёр Алімпійскіх гульняў, сярэбраны чэмпіён свету, ураджэнец г. Оршы.

3 ліпеня – 125 гадоў таму (1888) нарадзіўся Акашэў Канстанцін Васільевіч (1888–1931), адзін з першых расійскіх лётчыкаў, савецкі ваенны дзеяч, арганізатар авіяцыі, ураджэнец Віцебскай губерні.

3 ліпеня – 65 гадоў таму (1948) нарадзіўся Шыбека Захар Васільевіч, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, ураджэнец в. Асінаўка Сенненскага раёна.

3 ліпеня – 40 гадоў таму (1973) ў Дубровенскім раёне быў адкрыты мемарыяльны комплекс "Рыленкі".

3 ліпеня – 30 гадоў таму (1983) ў Докшыцкім раёне адкрыты мемарыяльны комплекс "Праклён фашызму".

4 ліпеня – 65 гадоў таму (1948) ў Віцебску адноўлена фабрыка "КІМ". Зараз – ААТ "КІМ".

5 ліпеня – 75 гадоў таму (1938) створаны Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.

7 ліпеня	– 85 гадоў	таму (1928) адбыўся I з'езд калгаснікаў Віцебшчыны.
8 ліпеня	– 45 гадоў	таму (1968) ў Аршанскім раёне створаны саўгас "Днепр". Зараз КУСГП "Днепр".
10 ліпеня	– 100 гадоў	таму (1913) нарадзілася Вайтовіч Ніна Трафімаўна (1913–1976), беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнка г. Верхнядзвінска.
11 ліпеня	– 130 гадоў	таму (1883) нарадзілася Акімава Вольга Дзмітрыеўна (1883–1969), беларускі вучоны-альголаг, адна з першых даследчыкаў альгафлоры на Беларусі, ураджэнка Полацкага раёна.
11 ліпеня	– 75 гадоў	таму (1938) пачала выходзіць раённая газета "Жыццё Прыдзвіння".
11 ліпеня	– 60 гадоў	таму (1953) нарадзілася Кабакова (Бязніцкая) Ларыса Віктараўна, беларуская спартсменка (веславанне на байдарках), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіёнка свету і Еўропы, ураджэнка в. Вугалеўшчына Талачынскага раёна.
12 ліпеня	– 95 гадоў	таму (1918) нарадзіўся Дудчык Павел Андрэевіч (1918–1994), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Казённыя Паршні Аршанскага раёна.
14 ліпеня	– 100 гадоў	таму (1913) нарадзіўся Глікман Гаўрыіл Давыдавіч (1913–2003), мастак, скульптар, ураджэнец г.п. Бешанковічы.
15 ліпеня	– 510 гадоў	таму (1503) ўпершыню ў пісьмовых крыніцах упамінаецца г.п. Шаркаўшчына як маёнтак Зяновічаў у складзе ВКЛ.
15 ліпеня	– 115 гадоў	таму (1898) нарадзіўся Сямашка Сцяпан Пятровіч (1898–1965), беларускі пісьменнік, празаік, ураджэнец в. Барылы Полацкага раёна.
15 ліпеня	– 65 гадоў	таму (1948) нарадзіўся Катляроў Ігар Васілевіч, вучоны-сацыёлаг і палітолаг, дзяржаўны дзеяч, ураджэнец г.п. Відзы Браслаўскага раёна.

віцебскай акварэлі. У яго работах у поўнай меры знайшлі адлюстраванне тыя магутныя традыцыі, якія стагоддзямі накопліваліся ў нетрах рэалістычнага мастацтва. Фундаментальнасць ведаў у галіне колеразнаўства, гісторыі, тэхнікі і тэхналогіі акварэльнага жывапісу сталі для мастака тым грунтам, які на працягу ўсіх этапаў творчасці фарміраваў яго погляды і творчыя прынцыпы.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Гугнін, М**. Адметнасць майстэрства і шчодрасць таленту / М. Гугнін, У. Пракапцоў // Мастацтва. — 1994. — № 8. — С. 22—24.

2. **Сталяроў** Іван Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 2002. — Т. 15. — С. 141.

3. **Сталяроў** Іван Міхайлавіч // Памяць : Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : БелЭн, 2003. — Кн. 2. — С. 538—539.

4. **Сталяроў** Іван Міхайлавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. — Т. 5. — С. 108.

камандаваннем М. П. Шмырова, ваяваў у дзеючай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту, узнагароджаны пяццю баявымі ўзнагародамі. У 1951 г. І. Сталяроў скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, у 1960 г. – Маскоўскі паліграфічны інстытут. У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1954 года. Выкладчык Віцебскага мастацка-графічнага вучылішча (1951–1958), Віцебскага педагагічнага інстытута (1959–1986, дацэнт з 1979). Член Саюза мастакоў Беларусі з 1967 г.

Творчасць Івана Міхайлавіча цяжка падзяліць на лірычны і камерны жывапіс. Бо амаль у кожным з твораў яны знітаваны так арганічна, што становіцца відавочным: толькі ўлюбёны ў свой край можа так адчуваць і дасканала перадаць яго настрой. Ва ўсіх работах перад намі паўстае мастак-лірык, які тонка адчувае і паэтычна перадае цудоўнае фарбамі.

Значнае месца ў творчасці І. Сталярова займае тэма Вялікай Айчыннай вайны. Ён сам быў актыўным удзельнікам партызанскага руху, снайперам, разведчыкам, удзельнічаў у прарыве трох блакад. Серыя твораў «Па партызанскіх сцежках», «Па слядах партызанскай славы» ўключае вялікую колькасць акварэльных аркушаў, у якіх з дасканалым майстэрствам перададзена атмасфера ваенных гадоў. Віцебшчыне прысвечаны серыі акварэляў «Керамзітавы завод» (1962), «Лескавічы» (1969), «Рабочая ўскраіна» (1974), «Браслаўшчына» (1976), «Віцебшчына – край блакітных азёр» (1984), пейзажы «Віцебскае ўзвышша» (1963), «На зыходзе лета» (1977), «Раніца туманная» (1984) і інш. Іван Міхайлавіч з'яўляецца аўтарам навучальнага дапаможніка «Акварэль. Матэрыялы і спосабы пісьма» (1980), альбома «Партызанская быль» (2005).

Шмат цікавых твораў зроблена мастаком у час творчых паездак з эцюднікам па Літве, Латвіі, Арменіі. У невялікім па памерах аркушы «Тракай» тонка перададзены не толькі характар Прыбалтыкі з яе архітэктурай, але і адметнасць прыроды.

За гады творчай дзейнасці Іван Сталяроў стварыў звыш 600 твораў, удзельнічаў у шматлікіх мастацкіх выстаўках. Ён – класік

15 ліпеня – 45 гадоў таму (1968) адкрыта Наваполацкае музычнае вучылішча.

18 ліпеня – 90 гадоў таму (1923) нарадзілася Ганестава Людміла Раманаўна (1923–2009), беларуская спявачка, заслужаная артыстка Беларусі, ураджэнка в. Калышкі Лёзненскага раёна.

21 ліпеня – 150 гадоў таму (1863) нарадзіўся Краснянскі Уладзімір Гаўрылавіч (1863–1930), гісторык, краязнавец, педагог, дырэктар Віцебскага рэальнага вучылішча (1911–1917 гг.).

27 ліпеня – 100 гадоў таму (1913) нарадзіўся Янчанка Ілья Платонавіч (1913–1999), поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец в. Калмакова Гарадоцкага раёна.

28 ліпеня – 185 гадоў таму (1828) нарадзіўся Гурка Іосіф Уладзіміравіч (сапр. Рамейка-Гурка; 1828–1901), вайсковы дзяржаўны дзеяч, генерал-фельдмаршал Расійскай арміі, ураджэнец Лёзненскага раёна.

28 ліпеня – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Бяляеў Ігнат Сцяпанавіч, паэт, перакладчык, ураджэнец Гарадоцкага раёна.

28 ліпеня – 85 гадоў таму (1928) нарадзіўся Валаховіч Леанід Ігнатавіч, беларускі вучоны-гісторык, кандыдат гістарычных навук, ураджэнец в. Лужкі Чашніцкага раёна.

29 ліпеня – 95 гадоў таму (1918) пачала выходзіць штотыднёвая газета Віцебскага губвыканкама. Выдавалася з 29.07.1918 г. па 09.12.1918 г. у Віцебску на рускай мове.

30 ліпеня – 90 гадоў таму (1923) адкрыта аддзяленне Промстройбанка ў Віцебску.

ЖНІВЕНЬ

1 жніўня – 95 гадоў таму (1918) ў Оршы пачала работу швейная майстэрня. Зараз – фабрыка індывідуальнага пашыву і рамонту адзення.

1 жніўня – 55 гадоў таму (1958) ў Лепелі адкрылася музычная школа.

2 жніўня – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Жарнасек Ілля Максімавіч (1918–1993), вучоны, доктар ваенных навук, ураджэнец в. Падымхі Лепельскага раёна.

2 жніўня – 20 гадоў таму (1993) ў Віцебску заснаваны Музей Марка Шагала.

5 жніўня – 250 гадоў таму (1763) нарадзіўся Кульнеў Якаў Пятровіч (1763–1812), ваенны дзеяч, герой Айчыннай вайны 1812 г. Загінуў на Расоншчыне падчас Клясціцкіх баёў 1812 г.

5 жніўня – 95 гадоў таму (1918) адбыўся з'езд Саветаў Віцебскага павета і губерні.

8 жніўня – 50 гадоў таму (1963) нарадзіўся Лапшын Ігар Алегавіч, беларускі спартсмен (лёгкая атлетыка, трайны скачок), заслужаны майстар спорту СССР, прызёр Алімпійскіх гульняў, чэмпіён свету і Еўропы, трэнер, ураджэнец г. Віцебска.

9 жніўня – 110 гадоў таму (1903) нарадзіўся Вавілаў Максім Андрэевіч (1903–1960), генерал-лейтэнант, ураджэнец г. Полацка.

10 жніўня – 115 гадоў таму (1898) нарадзіўся Даленга-Мастовіч Тадэвуш (сапр. Мастовіч; 1898–1939), польскі пісьменнік, журналіст, ураджэнец Глыбоцкага раёна.

10 жніўня – 80 гадоў таму (1933) нарадзіўся Грунтоў Пётр Сцяпанавіч, вучоны ў галіне транспартных сістэм, ураджэнец в. Гарнова Сенненскага раёна.

10 жніўня – 75 гадоў таму (1938) нарадзіўся Магіленка Анатоль Філімонавіч (1938–1997), вучоны ў галіне ветэрынарыі, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Беларусі, акадэмік Аграрнай акадэміі Расіі, ураджэнец в. Карабанавічы Дубровенскага раёна.

слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. — Т. 5. — С. 275—284.

6. **Свірка** Юрась // Памяць : Докшыцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 2004. — С. 637.

7. **Свирка** Юрась // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. — Т. 5. — С. 592.

8. **Хілько, В.** «Жыццё доўжыцца ў слове» / В. Хілько // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2008. — 3 мая. — С. 6.

9. **Юрась** Свірка / падрыхт. В. Жыбуль // Роднае слова. — 2008. — № 5. — С. 81.



СТАЛЯРОЎ ІВАН МІХАЙЛАВІЧ

Да 90-годдзя з дня нараджэння (1923)

Іван Міхайлавіч Сталяроў нарадзіўся ў Віцебску 20 мая 1923 года, тут прайшлі яго дзяцінства і юнацтва. Беларускі мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1993), педагог.

Студэнтам Віцебскага мастацкага вучылішча напаткала яго вайна. Ён быў партызанам І Беларускай партызанскай брыгады пад

Саветаў БССР і Літоўскай ССР.

Першы верш Ю. Свіркі «Новы крок» быў надрукаваны ў газеце «Піянер Беларусі» ў 1952 г. Першы зборнік вершаў «Шэпчуцца ліўні» выйшаў у 1959 г. Юрась Свірка з'яўляецца аўтарам паэтычных зборнікаў «Вечнасць» (1963), «Баравіна» (1967), «Крэўнасць» (1971), «Аўтограф» (1974), «Люблю і веру» (1975), «Памятная вярста» (1978), «Біяграфія памяці» (1981), «Ядранасць» (1983), «Паўшар'е блакіту» (1986), «Кружка з пясчаным дном» (1990). Змест паэтычных кніг Ю. Свіркі складаюць малюнкі прыроды, жыццё і праца людзей, гераічныя і мужныя старонкі барацьбы з ворагам у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Пісаў Ю. Свірка і для дзяцей. Яго апошні зборнік «Мурашыны стажор» выйшаў у 2004 г.

На беларускую мову Юрый Мікалаевіч пераклаў асобныя творы А. Пушкіна, А. Фета, Ф. Цютчава, Б. Пастарнака, А. Твардоўскага, Я. Смелякова, вершы украінскіх, літоўскіх, малдаўскіх, грузінскіх, азербайджанскіх, армянскіх, узбекскіх, татарскіх, асецінскіх, чувашскіх паэтаў. Многія яго вершы перакладзены на рускую, украінскую, літоўскую, грузінскую, таджыкскую, польскую, англійскую мовы. Песні на словы яго вершаў напісалі М. Аладаў, Ю. Семяняка, М. Наско і інш.

Памёр Юрый Мікалаевіч Свірка 2 верасня 2004 года.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Барадулін, Р.** Першы склад перад націскам / Р. Барадулін // Маладосць. — 1993. — № 4. — С. 214—223.

2. **Гніламёдаў, У.** Атожылак долі сялянскай : Юрась Свірка / У. Гніламёдаў // Ля аднаго вогнішча : літаратурна-крытычныя артыкулы / У. Гніламёдаў. — Мн. : Юнацтва, 1984. — С. 144—153.

3. **Палачанін, Ф.** Юрась Свірка / Ф. Палачанін // Докшыцкі край / Ф. А. Палачанін. — Мн. : Беларусь, 2009. — С. 128—129.

4. **Свірка** Юрась // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 2002. — Т. 14. — С. 260.

5. **Свірка** Юрась // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны

11 жніўня	– 25 гадоў	таму (1988) заснаваны музей-сядзіба І.Я. Рэпіна ў Віцебскім раёне.
13 жніўня	– 100 гадоў	таму (1913) нарадзіўся Багатыроў Анатоль Васілевіч (1913–2003), кампазітар, педагог, народны артыст Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.
13 жніўня	– 95 гадоў	таму (1918) нарадзіўся Азміцель Фёдар Фёдаравіч (1918–1944), удзельнік партызанскага руху ў Віцебскай і Мінскай абласцях у Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.
13 жніўня	– 70 гадоў	таму (1943) нарадзіўся Высоцкі Эдуард Аляксандравіч, беларускі геолаг, ураджэнец г. Віцебска.
13 жніўня	– 50 гадоў	таму (1963) ў Наваполацку адкрыта музычная школа.
13 жніўня	– 40 гадоў	таму (1973) нарадзілася Губкіна Людміла Алегаўна, беларуская спартсменка (лёгкая атлетыка, кіданне молата), майстар спорту Беларусі міжнароднага класа, прызёр чэмпіяната Еўропы, ураджэнка г. Наваполацка.
15 жніўня	– 95 гадоў	таму (1918) нарадзіўся Капіч Мікалай Федаравіч, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, ураджэнец в. Шаенка Шумілінскага раёна.
15 жніўня	– 95 гадоў	таму (1918) заснавана Віцебскае губернскае ўпраўленне міліцыі.
15 жніўня	– 45 гадоў	таму (1968) адчынена музычная школа ў г. Дуброўна.
16 жніўня	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Фёдараў Мікалай Яўгенавіч (1938–2002), беларускі вучоны ў галіне гастраэнтэралогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец г. Віцебска.
20 жніўня	– 85 гадоў	таму (1928) пачало работу віцебскае швейнае аб'яднанне "Рассвет".
20 жніўня	– 55 гадоў	таму (1958) нарадзіўся Міхасёў Віктар Уладзіміравіч, беларускі краязнавец, ураджэнец г. Барані.

25 жніўня – 60 гадоў таму (1953) нарадзіўся Арлоў Уладзімір Аляксеевіч, беларускі пісьменнік, ураджэнец г. Полацка.

27 жніўня – 85 гадоў таму (1928) нарадзіўся Вакар Сяргей Міхайлавіч (1928–1998), скульптар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

27 жніўня – 75 гадоў таму (1938) нарадзіўся Бекіш Освальд-Ян Лявонавіч (1938–2010), беларускі вучоны ў вобласці імуналогіі, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, прарэктар ВДМУ (1985–1997 гг.).

28 жніўня – 125 гадоў таму (1888) нарадзіўся Багдановіч Анатоль Васільевіч (1888–1969), беларускі і рускі мовазнавец, ураджэнец в. Луначарскае Верхнядзвінскага раёна.

30 жніўня – 65 гадоў таму (1948) Савет Міністраў БССР прыняў пастанову "Аб зацвярджэнні праекта планіроўкі горада Оршы Віцебскай вобласці".

ВЕРАСЕНЬ

1 верасня – 205 гадоў таму (1808) ў Віцебску адкрыта губернская музычная Аляксандраўская акадэмія.

1 верасня – 90 гадоў таму (1923) заснаваны Віцебскі кааператыўны тэхнікум.

1 верасня – 60 гадоў таму (1953) адчынены Полацкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Ф. Скарыны. Існаваў да 1959 г.

1 верасня – 35 гадоў таму (1978) пушчана першая чарга віцебскага тралейбуса.

1 верасня – 25 гадоў таму (1988) ў Полацку адкрыта ПТВ-233.

1 верасня – 20 гадоў таму (1993) ў Наваполацку адчынены ліцэй. Зараз ліцэй пры Полацкім дзяржаўным універсітэце.

МАЙ

СВІРКА ЮРАСЬ

Да 80-годдзя з дня нараджэння (1933)

Свірка Юрась (сапр. Юрый Мікалаевіч) нарадзіўся 6 мая 1933 г. у в. Маргавіца Докшыцкага раёна ў сялянскай сям'і. Бацька, Мікалай Іванавіч, быў удзельнікам грамадзянскай вайны. Маці, Акуліна Пятроўна, ведала шмат казак, баек, любіла спяваць беларускія народныя песні. Маленства Ю. Свіркі прайшло ў жахлівыя ваенныя гады. Уласнымі вачыма бачыў ён за калючай агароджай лагера для ваеннапалонных галодных і змучаных вязняў. Усё гэта пакінула след, абвастрыла асабістае перажыванне.

У 1953 г. Ю. Свірка скончыў Бягомльскую сярэднюю школу і паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Белддзяржуніверсітэта. Пасля заканчэння БДУ ў 1959 г. працаваў у часопісе «Коммунист Белоруссии», затым у газеце «Чырвоная змена» (1960-1961). Доўгі час Ю. Свірка займаў пасаду старшага рэдактара літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё (1961-1975). З 1975 г. – загадчык аддзела прозы і паэзіі газеты «Літаратура і мастацтва».

Паэт стаў членам Саюза пісьменнікаў СССР у 1961 г., з'яўляўся членам Рады Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1990 г. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова за зборнік паэзіі «Узаемнасць» (1993). Узнагароджаны медалём, Ганаровай граматай і граматамі Вярхоўных

2002. — 25 чэрв. — С. 2.

2. **Прудников, М. С.** Избранное : повести / М. С. Прудников. — М. : Воениздат, 1988. — 543 с.

3. **Прудников, М. С.** Неуловимые / М. С. Прудников. — Ярославль : Верхне-Волж. кн. изд-во, 1964. — 207 с. — (Военные мемуары).

4. **Прудников, М. С.** Неуловимые действуют / М. С. Прудников. — М. : Воениздат, 1965. — 176 с.

5. **Прудников, М. С.** Особое задание / М. С. Прудников. — М. : Мол. гвардия, 1969. — 303 с.

6. **Прудников, М. С.** Пароль получен : художественно-документальная повесть / М. С. Прудников. — М. : Политиздат, 1980. — 280 с.

7. **Прудников, М. С.** Разведчики «Неуловимых» : документальные повести / М. С. Прудников. — М. : Сов. Россия, 1972. — 288 с.

8. **Туравецкі, Б.** Старонкі подзвігу / Б. Туравецкі // Чырвоная змена. — 1973. — 26 верас. — С. 4.

9. **Чубукоў, М.** Камандзір Няўлоўных / М. Чубукоў // Звязда. — 1975. — 2 сак. — С. 4.

2 верасня – 120 гадоў таму (1893) нарадзіўся Рыжыкаў Іосіф Іванавіч (1893–1979), партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Рацэва Талачынскага раёна.

2 верасня – 120 гадоў таму (1893) ў Віцебску адкрыты царкоўна-археалагічны музей. З 1919 г. большасць матэрыялаў перададзена Віцебскаму губернскаму музею. Зараз – Віцебскі абласны краязнаўчы музей.

3 верасня – 65 гадоў таму (1948) нарадзіўся Правалінскі Уладзімір Міхайлавіч, беларускі эстрадны спявак, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

4 верасня – 65 гадоў таму (1948) нарадзіўся Лапшын Аляксандр Пятровіч, мастак-афарміцель Віцебскага камбіната "Мастацтва".

5 верасня – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Явіч Пётр Максавіч (1918–2008), мастак-жывапісец. Жыў і працаваў ў Віцебску.

5 верасня – 55 гадоў таму (1958) нарадзіўся Тузікаў Аляксандр Васілевіч, вучоны, доктар фізіка-матэматычных навук, ураджэнец г. Полацка.

7 верасня – 85 гадоў таму (1928) нарадзіўся Пузікаў Віктар Мітрафанавіч, філосаф, вучоны, культуролаг, ураджэнец Шумілінскага раёна.

8 верасня – 95 гадоў таму (1918) адбыўся III Віцебскі губернскі з’езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

9 верасня – 60 гадоў таму (1953) нарадзіўся Абразевіч Іван Канстанцінавіч, хормайстар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ураджэнец в. Вяжышча Бешанковіцкага раёна.

12 верасня – 95 гадоў таму (1918) ў Віцебску адкрыта Народнае мастацкае вучылішча.

12 верасня – 35 гадоў таму (1978) пачаў працаваць новы аэрапорт г. Віцебска.

14 верасня – 90 гадоў таму (1923) нарадзіўся Уласенка Мікалай Васільевіч, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнец в. Новыя Ранчыцы Бешанковіцкага раёна.

14 верасня – 45 гадоў таму (1968) нарадзіўся Сасімовіч Уладзімір Мікалаевіч, беларускі спартсмен і трэнер (лёгкая атлетыка, кіданне кап'я), майстар спорту СССР міжнароднага класа, чэмпіён свету сярод юніёраў, ураджэнец в. Ільінка Талачынскага раёна.

15 верасня – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Пугачоў Іосіф Антонавіч, жывапісец, самадзейны разьбяр па дрэве, ураджэнец Ушацкага раёна.

16 верасня – 65 гадоў таму (1948) нарадзілася Быстрова Людміла Карнаэліеўна, архітэктар, член Саюза архітэктараў Беларусі, ураджэнка в. Заскаркі Полацкага раёна.

19 верасня – 80 гадоў таму (1933) нарадзіўся Швед Пётр Іванавіч (1933–2003), вучоны ў галіне аховы паверхні цвёрдых цел палімернымі матэрыяламі, былы рэктар Наваполацкага палітэхнічнага інстытута, ураджэнец в. Шантарава Міёрскага раёна.

20 верасня – 75 гадоў таму (1938) нарадзіўся Міхалевіч Аляксандр Аляксандравіч, вучоны ў галіне ядзернай энергетыкі, акадэмік НАН Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

23 верасня – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Маўзон Аркадзь (сапр. Маўшэнзон Арон Іосіфавіч; 1918–1977), драматург, ураджэнец г. Віцебска.

24 верасня – 60 гадоў таму (1953) ў Віцебску адчынілася Віцебская гарадская масавая бібліятэка імя Л. Талстога.

25 верасня – 165 гадоў таму (1848) нарадзіўся Федаровіч Вацлаў Пятровіч (1848–1911), краязнавец, калекцыянер, юрыст. Друкаваў артыкулы па гісторыі Віцебшчыны, сабраў археалагічныя і нумізматычныя калекцыі, якія ўвайшлі ў 1924 г. у склад абласнога краязнаўчага музея.

27 верасня – 110 гадоў таму (1903) нарадзілася Харужая Вера Захараўна (1903–1942), Герой Савецкага Саюза, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Віцебскага падполля.

27 верасня – 75 гадоў таму (1938) Полацк стаў горадам абласнога падпарадкавання.

27 верасня – 75 гадоў таму (1938) Бягомлю нададзены статут гарадскога пасёлка.

У сакавіку 1942 года атрад дабраўся да намечанага раёна і размясціўся ў лясах пад Полацкам. Так пачалася біяграфія брыгады «Неуловимые», якая вырасла з невялікай групы байцоў у грозную баявую сілу. За ўвесь перыяд баявой дзейнасці ў брыгадзе налічвалася 16 атрадаў. Брыгада «Неуловимые» была шматнацыянальнай. У яе радах змагаліся рускія, украінцы, беларусы, латышы, грузіны, яўрэі, казахі, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў. Партызаны брыгады, як і народныя мсціўцы іншых партызанскіх фарміраванняў, днём і ноччу наносілі моцныя ўдары па ворагу на тэрыторыі Полаччыны, Віцебскай і іншых абласцей Беларусі. Былі выратаваны выхаванцы двух дзіцячых дамоў. Аператыўным шляхам былі вызвалены з лагераў больш за 1000 ваеннапалонных. Атрадам былі здабыты і перададзены ў Маскву 150 сакрэтных звестак аб праціўніку і шыфраваных радыёграм. Дзейнасць і мужныя подзвігі членаў брыгады Прудзікаў потым апіша ў сваіх кнігах.

У 1943 годзе М. С. Прудзікаў быў адазваны ў Маскву. З мая гэтага ж года пачаў службу ў войсках НКУС, НКДБ. У 1953 годзе скончыў Ваенна-юрыдычную акадэмію.

У 1970 годзе Міхаілу Сідаравічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. З 1970 года ён – генерал-маёр. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Прудзікаў Міхаіл Сідаравіч – член Саюза пісьменнікаў СССР з 1975 года. Аўтар шэрагу кніг, п’ес, мемуараў. Сярод якіх: «Неуловимые», «Неуловимые» действуют», «Разведчики «Неуловимых», «Особое задание». Па яго сцэнарыю зняты кінафільм « Как вас теперь называть?», які расказвае пра слаўныя подзвігі савецкіх патрыётаў у гады Вялікай Айчыннай вайны на беларускай зямлі.

Памёр у 1995 годзе.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Глезін, Б. Л.** «Няўлоўныя» / Б. Л. Глезін // Полацкі веснік. —

КРАСАВІК

ПРУДНІКАЎ МІХАІЛ СІДАРАВІЧ

Да 100-годдзя з дня нараджэння (1913)

Міхаіл Сідаравіч Прудзікаў нарадзіўся 15 красавіка 1913 года ў вёсцы Новапакроўка Іжморскага раёна Кемераўскай вобласці. З сялянскай сям'і. Закончыў няпоўную сярэднюю школу. У 1930 годзе па пуцёўцы камсамола адпраўлены ў рачны флот. Быў матросам на буксірным параходзе «Новосибирск». Затым яму давялося служыць на граніцы, удзельнічаць у баях супраць банд басмачоў у Сярэдняй Азіі. Ужо тады праявіліся яго смеласць і арганізатарскія здольнасці.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, М. Прудзікаў быў сярод абаронцаў Радзімы. У баях за Маскву 29-гадовы старшы лейтэнант Прудзікаў камандаваў батальёнам спецыяльнага прызначэння, які быў сфарміраваны з добраахвотнікаў. Нямала яркіх старонак упісалі байцы батальёна ў летапіс гістарычных падзей абароны Масквы.

Калі ворага адагналі ад сцен сталіцы, Прудзікаў атрымаў новае заданне. Са сваёй групай ён павінен быў перайсці лінію фронту і перабрацца на тэрыторыю Беларусі. Тут ім трэба было разгарнуць дыверсійную і разведвальную работу. Для выканання гэтага задання было адабрана 29 чалавек. Усе яны мелі немалы франтавы вопыт, удзельнічалі ў многіх баях, але дзейнічаць у глыбокім тыле праціўніка ім давялося ўпершыню.

27 верасня – 75 гадоў таму (1938) мястэчку Ушачы нададзены статус гарадскога пасёлка.

27 верасня – 75 гадоў таму (1938) мястэчка Дрыса пераўтворана ў горад Дрыса Дрысенскага раёна. Зараз г. Верхнядзвінск Верхнядзвінскага раёна.

28 верасня – 305 гадоў таму (1708) Віцебск быў спалены па загаду Пятра I у сувязі з Паўночнай вайной.

28 верасня – 95 гадоў таму (1918) часткі Чырвонай Арміі ўступілі ў г. Лепель.

28 верасня – 95 гадоў таму (1918) нарадзілася Галубкова Ганна Арцем'еўна (1918–2003), Герой Сацыялістычнай Працы, супрацоўніца абутковай фабрыкі "Чырвоны Кастрычнік", ураджэнка г. Віцебска.

29 верасня – 40 гадоў таму (1973) ў Віцебску адкрыты бюст Героя Савецкага Саюза В.З. Харужай (скульптар З. Азгур).

30 верасня – 285 гадоў таму (1728) нарадзіўся Пачабут-Адляніцкі Марцін (1728–1810), беларускі асветнік і астраном. Вучыўся ў Полацкім езуіцкім калегіуме.

30 верасня – 120 гадоў таму (1893) нарадзіўся Мышкоў Канстанцін Раманавіч (1893–1942), генерал-лейтэнант артылерыі, ураджэнец в. Горкі Расонскага раёна.

КАСТРЫЧНІК

160 гадоў таму (1853) віцебскім віцэ-губернатарам стаў пісьменнік І.І. Лажэчнікаў.

45 гадоў таму (1968) віцебская гімнастка Л. Петрык стала чэмпіёнкай XIX Алімпійскіх гульняў у Мехіка.

35 гадоў таму (1978) з канвеера тэлезавода выйшаў першы тэлевізар "Віцязь".

1 кастрычніка – 95 гадоў таму (1918) Віцебскі настаўніцкі інстытут быў пераўтвораны ў педагагічны.

1 кастрычніка	– 70 гадоў	таму (1943) пры фарсіраванні Дняпра здзейсніў свой подзвіг Багданаў Рыгор Багданавіч (1910–1943), Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Марцюшы Гарадоцкага раёна.
1 кастрычніка	– 65 гадоў	таму (1948) ў Полацку была адкрыта дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога.
3 кастрычніка	– 75 гадоў	таму (1938) была адкрыта Стральцоўская базавая школа Шаркаўшчынскага раёна.
3 кастрычніка	– 60 гадоў	таму (1953) нарадзіўся Рудэнка Юрый Васільевіч, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ураджэнец г. Віцебска.
5 кастрычніка	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Сцепаненка Аляксандр Васільевіч (1938–2005), беларускі вучоны ў галіне апрацоўкі металаў, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец г. Оршы.
5 кастрычніка	– 65 гадоў	таму (1948) нарадзіўся Скавародка Алег Аляксандравіч, беларускі жывапісец, ураджэнец в. Ассё Лепельскага раёна.
6 кастрычніка	– 195 гадоў	таму (1818) нарадзіўся Заранка Сяргей Канстанцінавіч (1818–1871), жывапісец, педагог, ураджэнец в. Ляды Дубровенскага раёна.
6 кастрычніка	– 55 гадоў	таму (1958) нарадзілася Гаркунова Надзея Генадзьеўна, беларускі кінарэжысёр, сцэнарыст, ураджэнка г. Віцебска.
7 кастрычніка	– 225 гадоў	таму (1788) нарадзіўся Насовіч Іван Іванавіч (1788–1877), беларускі мовазнавец-лексікограф, фалькларыст, этнограф, настаўнік, інспектар Аршанскага павятовага вучылішча.
7 кастрычніка	– 70 гадоў	таму (1943) нарадзіўся Шыпіла Яўген Патафеевіч (1943–1999), акцёр тэатра імя Я. Коласа, народны артыст Беларусі, ураджэнец в. Відокі Верхнядзвінскага раёна.
8 кастрычніка	– 75 гадоў	таму (1938) нарадзіўся Якавенка Уладзімір Андрэевіч, беларускі вучоны-фізік, педагог, заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі, ураджэнец в. Чырына Дубровенскага раёна.

«Парог» А. Дударава), Марцявічус («Кастусь Каліноўскі» У. Караткевіча), Кароль Лір з аднайменнай трагедыі У. Шэкспіра, Гапон («Залёты» В. Дуніна-Марцінкевіча) і іншыя.

За вялікія творчыя поспехі, актыўную прапаганду беларускага тэатральнага мастацтва Трушко Леанід Ігнатавіч удастоены ганаровых званняў «Заслужаны артыст БССР» (1986), «Народны артыст Беларусі» (1996).

Актыўна здымаўся ў кіно. Найбольш папулярныя кінастужкі з удзелам Л. Трушко: «Плач перапёлкі» і «Новая зямля».

Памёр 10 студзеня 2010 года.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Дашкевіч, С.** Артыст, чалавек, беларус / С. Дашкевіч // Віцьбічы = Витьбичи. — 2003. — 4 марта. — С. 3.

2. **Дашкевіч, С. «**Маршал майго сэрца» / С. Дашкевіч // Віцьбычы = Витьбичи. — 2008. — 11 марта. — С. 7.

3. **Катовіч, Т.** Праз спачуванне / Т. Катовіч // Літаратура і мастацтва. — 1989. — 25 жн. — С. 10.

4. **Леанід** Трушко // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі : у 4 т. / уклад., навук. рэд., уступ. арт. і камент. А. В. Сабалеўскага. — Мн. : Бел. навука, 2005. — Т. 4 : XX — пачатак XXI стагоддз**я. — С. 311—313.**

5. Трушко Леанід Ігнатавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 2002. — Т. 15. — С. 541.

6. **Трушко** Леанід Ігнатавіч // Віцьбічы = Витьбичи. — 2010. — 12 янв. — С. 7.

7. **Трушко** Леанід Ігнатавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. — Т. 5. — С. 280.



ТРУШКО ЛЕАНІД ІГНАТАВІЧ

Да 75-годдзя з дня нараджэння (1938)

Беларускі акцёр Леанід Ігнатавіч Трушко нарадзіўся 4 сакавіка 1938 года ў горадзе Оршы. У 1961 годзе, пасля службы ў радах Савецкай Арміі, таленавіты юнак быў запрошаны ў народны тэатр Аршанскага льнокамбіната. У 1965 годзе народны тэатр выступаў на сцэне Крамлёўскага тэатра ў Маскве са спектаклем «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна, дзе Леанід Трушко бліскуча сыграў ролю Рыбакова і стаў лаўрэатам Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва. З аматарскай сцэны малады акцёр пасля заканчэння студыі трапіў у Беларускі драматычны тэатр імя Я. Коласа. На коласаўскай сцэне працаваў у 1967–1999 гадах. Першая значная роля – Мікіта ў спектаклі «Улада цемры» Л. Талстога – прынесла акцёру вялікі поспех.

Больш за сто вобразаў стварыў акцёр на тэатральнай сцэне ў спектаклях: «Званы Віцебска» У. Караткевіча (Дарафей), «Трыбунал» А. Макаёнка (Сырадоеў), «Трэцяя, патэтычная» М. Пагодзіна (Дзятлаў). Мастацтва Трушко адметнае глыбінёй псіхалагічнай распрацоўкі, бытавой дакладнасцю, ідэйнай мэтанакіраванасцю вобразаў. Яго творчасць была высока адзначана крытыкай і тэатральнай грамадскасцю. Творчай сталасцю, глыбокім пранікненнем у сутнасць драматургічнага матэрыялу вылучаюцца вобразы: Цецераў («Мяшчане» М. Горкага), Лапахін («Вішнёвы сад» А. Чэхава), Дзерваед, Буслай і бацька Буслая («Радавыя»,

8 кастрычніка – 65 гадоў таму (1948) нарадзіўся Дронаў Уладзімір Мікалаевіч, контр-адмірал, Герой Расійскай Федэрацыі, ураджэнец г.п. Бягомль Докшыцкага раёна.

12 кастрычніка – 70 гадоў таму (1943) вызвалены г.п. Лёзна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

13 кастрычніка – 150 гадоў таму (1863) нарадзіўся Лазарэвіч-Шапялевіч Леў Юльянавіч (сапр. Шапялевіч; 1863–1909), археолаг, гісторык літаратуры, ураджэнец г. Віцебска.

13 кастрычніка – 125 гадоў таму (1888) нарадзіўся Драздовіч Язэп Нарцызавіч (1888–1954), мастак, скульптар, этнограф, фалькларыст, пісьменнік, ураджэнец Глыбоцкага раёна.

13 кастрычніка – 125 гадоў таму (1888) нарадзіўся Купалаў Пётр Сцяпанавіч (1888–1964), расійскі вучоны ў галіне фізіялогіі, акадэмік АМН СССР, ураджэнец Віцебскай вобласці.

13 кастрычніка – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Шэлепень Аляксандр Кірылавіч (1918–1964), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец Расонскага раёна.

14 кастрычніка – 110 гадоў таму (1903) нарадзіўся Рыдлеўскі Лявон (1903–1953), беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, ураджэнец в. Ульянавічы Сенненскага раёна.

14 кастрычніка – 85 гадоў таму (1928) нарадзіўся Назараў Сяргей Іванавіч (1928–1999), беларускі вучоны ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, доктар тэхнічных навук, прафесар, ураджэнец в. Барадзіно Дубровенскага раёна.

18 кастрычніка – 70 гадоў таму (1943) нарадзіўся Дзмітрыеў Генадзь Рыгоравіч, беларускі паэт, ураджэнец Гарадоцкага раёна.

19 кастрычніка – 65 гадоў таму (1948) створаны Віцебскі абласны савет прафсаюзаў.

23 кастрычніка – 65 гадоў таму (1948) нарадзіўся Гіруцкі Анатоль Антонавіч, беларускі мовазнавец, пісьменнік, доктар філалагічных навук, прафесар, ураджэнец Талачынскага раёна.

25 кастрычніка – 105 гадоў таму (1908) нарадзілася Свярдлова Роза Міронаўна (1908–2003), беларуская і расійская кінаактрыса, заслужаная артыстка Беларусі, ураджэнка г. Віцебска.

25 кастрычніка – 80 гадоў таму (1933) нарадзілася Шчасная Нінэль Іванаўна, беларускі мастак, жывапісец, графік, ураджэнка г. Полацка.

28 кастрычніка – 85 гадоў таму (1928) выдаў першую прадукцыю Віцебскі фанерны завод. Зараз – дрэваапрацоўчы камбінат вытворчага аб'яднання "Віцебскдрэў".

28 кастрычніка – 70 гадоў таму (1943) г.п. Сураж быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

29 кастрычніка – 145 гадоў таму (1868) ў Віцебску пры губернскім статыстычным камітэце быў адкрыты музей старажытнасцей.

30 кастрычніка – 415 гадоў таму (1598) ў прывілеі гетмана ВКЛ Крыштофа Радзівіла паведамляецца аб заснаванні ім горада Барані.

30 кастрычніка – 30 гадоў таму (1983) ў Новалукомлі быў пушчаны ў строй хлебазавод.

ЛІСТАПАД

75 гадоў таму (1938) пачаў работу Лепельскі калгасна-саўгасны тэатр. У красавіку 1941 г. быў пераведзены ў Вілейскую вобласць.

70 гадоў таму (1943) пачала выходзіць газета "Партызанская праўда" – орган Докшыцкага падпольнага РК КП(б)Б. У 1944–1962 гг. газета называлася "Ленінская праўда", у 1962–1965 гг. – не выдавалася, з 1965 г. – "Ленінская трыбуна", з 1991 г. – "Родныя вытокі".

60 гадоў таму (1953) заснавана Лепельская дзіцячая бібліятэка.

40 гадоў таму (1973) створаны актэт "Віцебскія віртуозы" пры Віцебскай абласной філармоніі.

4. **Кляшторный** Тодор Тодорович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. — Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. — Кн. 1. — С. 497.

5. **Марціновіч, А**. Светлы лірык на пераломе дзён / А. Марціновіч // Беларуская думка. — 2003. — № 2. — С. 142—149.

6. **Прудникаў, П. І**. Далёкае, але не забытае : успаміны / П. І. Прудникаў. — Мн. : Маст. літ., 1988. — С. 89—96.

7. **Рублеўскі, С**. Нязгасны ветразь Тодара / С. Рублеўскі // Народнае слова. — 2008. — 15 сак. — С. 9.

8. **Сільвановіч, С.** Узнёслы гімн творцу / С. Сільвановіч // Лепельскі край. — 2009. — 24 сак. — С. 3.

9. **Тодар** Кляшторны // Памяць : Лепельскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: В. Я. Ланікіна [і інш.] ; уклад.: В. Я. Ланікіна, А. У. Стэльмах ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Беларусь, 1999. — С. 145—148.

член антысавецкай арганізацыі, якой на самой справе не існавала. У 1937 годзе прысуджаны да вышэйшай меры пакарання. Адначасова саслана ў Акмолінскі лагер і жонка з малодшай дачкой. Старэйшыя дзеці трапілі ў дзіцячы дом. Паэт быў рэабілітаваны пасмяротна ў 1957 годзе.

Асноўны змест паэзіі Т. Кляшторнага – рамантычнае апяванне героікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, услаўленне сацыялістычнага будаўніцтва. Асобнае месца ў яго творчасці займае паэма «Калі асядае муць», у якой адчуваецца расчараванне аўтара палітыкай НЭПа.

Таленавіты паэт прысвячаў свае творы прыгажосці роднай зямлі, яе людзям. Чалавек адкрытай душы, чулага і шчырага сэрца, Тодар Кляшторны прыцягваў да сябе людзей. Уся яго творчасць брала пачатак ад родных каранёў, якія ішлі з самых глыбінь жыцця, ад роднага Парэчча, матчынай пяшчотнай песні. Яго творы перакладзены на літоўскую, рускую і ўкраінскую мовы. На вершы Т. Кляшторнага напісаны песні. У 1960 годзе выдадзена кніга яго паэзіі «Залатое вязьмо», а ў 1970 годзе – «Выбраныя творы».

Светлая памяць пра славутага земляка захоўваецца на Лепельшчыне. На базе Каменскага сельскага Дома культуры створаны бібліятэка-музей Тодара Кляшторнага, дзе можна ўбачыць калыску паэта, яго ўласныя рэчы, сямейныя фотаздымкі.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Варатынская, Г.** Трагічны лёс «беларускага Ясеніна» / Г. Варатынская // Патрыёт (Ушачы). — 2003. — 11 чэрв. — С. 2.

2. **Кляшторны** Тодар // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1994. — Т. 3. — С. 284—287.

3. **Кляшторны** Тодар Тодаравіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 2000. — Т. 8. — С. 356—357.

1 лістапада – 145 гадоў таму (1868) нарадзіўся Даўгяла Дзмітрый Іванавіч (1868–1942), беларускі гісторык, археограф, архівіст, крыніцазнавец, ураджэнец в. Казьяны Шумілінскага раёна.

1 лістапада – 85 гадоў таму (1928) нарадзіўся Клейн Барыс Самуілавіч, гісторык, ураджэнец г. Віцебска.

3 лістапада – 80 гадоў таму (1933) нарадзіўся Вінаградаў Віктар Ніканавіч, беларускі педагог, доктар педагагічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі, ураджэнец в. Замасточча Гарадоцкага раёна.

4 лістапада – 60 гадоў таму (1953) ў Лепелі быў створаны краязнаўчы музей.

5 лістапада – 70 гадоў таму (1943) загінулі члены Обальскай падпольнай камсамольскай арганізацыі.

5 лістапада – 40 гадоў таму (1973) ў Віцебску адкрыты новы трамвайны маршрут "праспект Фрунзе – вуліца Гагарына".

5 лістапада – 30 гадоў таму (1983) ў Віцебску адкрыты трэці маршрут тралейбуса.

6 лістапада – 60 гадоў таму (1953) нарадзіўся Карпан Аляксандр Фёдаравіч, беларускі мастак, жывапісец, выкладчык кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава.

8 лістапада – 130 гадоў таму (1883) нарадзіўся Ластоўскі Вацлаў Юстынавіч (1883–1938), беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, гісторык, філолаг, этнограф, пісьменнік, публіцыст, ураджэнец Глыбоцкага раёна.

8 лістапада – 110 гадоў таму (1903) нарадзіўся Юркоў Іосіф Андрыянавіч (1903–1976), Герой Сацыялістычнай Працы, гаспадарчы дзеяч Беларусі, заслужаны будаўнік БССР, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец г. Оршы.

8 лістапада – 65 гадоў таму (1948) нарадзіўся Бяспалы Аляксандр Сяргеевіч, беларускі акцёр і рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Полацка.

11 лістапада – 165 гадоў таму (1848) Мікалай I зацвердзіў новы план г. Оршы.

11 лістапада – 110 гадоў таму (1903) нарадзіўся Ільінскі Аляксандр Канстанцінавіч (1903–1967), беларускі акцёр, народны артыст Беларусі. З 1926 г. акцёр тэатра імя Я. Коласа.

11 лістапада – 110 гадоў таму (1903) нарадзіўся Блахін Фёдар Цімафеевіч (1903–1974), Герой Савецкага Саюза, Ганаровы грамадзянін г. Віцебска.

11 лістапада – 50 гадоў таму (1963) ў Оршы адкрыты філіял Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

12 лістапада – 145 гадоў таму (1868) нарадзілася Місуна Ганна Баляславаўна (1868–1922), адна з першых геолагаў-жанчын, ураджэнка Чашніцкага раёна.

14 лістапада – 130 гадоў таму (1883) ў Оршы заснаваны піўзавод.

15 лістапада – 60 гадоў таму (1953) нарадзіўся Шульга Сяргей Мікалаевіч, беларускі акцёр, кінарэжысёр, артыст тэатра імя Я. Коласа (1976–1977 гг., 1979–1980 гг.).

16 лістапада – 120 гадоў таму (1893) нарадзілася Чарняўская Леаніла Усцінаўна (1893–1976), пісьменніца, ураджэнка Докшыцкага раёна.

16 лістапада – 90 гадоў таму (1923) нарадзіўся Крукоўскі Мікалай Ігнатавіч, беларускі філосаф, мовазнавец, доктар філасофскіх навук, кандыдат філалагічных навук, прафесар, ураджэнец в. Машкова Аршанскага раёна.

17 лістапада – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Лугаўскі Дзмітрый Іванавіч (1918–1989), Герой Савецкага Саюза, палкоўнік, ураджэнец г. Віцебска.

17 лістапада – 80 гадоў таму (1933) ў Оршы адкрыта планёрная станцыя.

18 лістапада – 130 гадоў таму (1883) нарадзілася Міронава Кацярына Эдуардаўна (1883–1946), беларуская актрыса, заслужаная артыстка Беларусі, ураджэнка г. Оршы.

21 лістапада – 95 гадоў таму (1918) г. Полацк быў вызвалены ад нямецкай акупацыі.

23 лістапада – 420 гадоў таму (1593) Кароль Польскі і Вялікі Князь Літоўскі Жыгімонт III Ваза выдаў грамату, з якой вынікае, што аршанцы ўдасканалілі прынцыпы магдэбургскага самакіравання ў сваім горадзе.

САКАВІК

КЛЯШТОРНЫ ТОДАР ТОДАРАВІЧ

Да 110-годдзя з дня нараджэння (1903)

Тодар Тодаравіч Кляшторны нарадзіўся 11 сакавіка 1903 года ў вёсцы Парэчча Лепельскага раёна ў беднай сялянскай сям'і. Беларускі паэт, перакладчык. З 1934 года – член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Пасля службы ў Чырвонай Арміі вучыўся на рабфаку ў горадзе Оршы, а затым, перабраўшыся ў Мінск, паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, далучыўся да актыўнага літаратурнага жыцця. Быў членам таварыстваў «Маладняк», «Узвышша», Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. Працаваў на радыё, у рэдакцыях рэспубліканскіх газет і часопісаў.

Першыя вершы «На смерць Фрунзе», «Блындае вечар» былі надрукаваны ў часопісе «Аршанскі маладняк» у 1925 годзе. Першы зборнік яго паэзіі «Кляновыя завеі» выйшаў у 1927 годзе. Потым пачалі выходзіць і іншыя – «Светацені» (1928), «Ветразі» (1929). У 1930 годзе асобным выданнем выйшла паэма «Палі загаманілі».

А вось наступны крок у літаратуры атрымаўся не шпаркім, а запаволеным, зробленым з відавочна большымі высілкамі. Паэтычны зборнік з гуллівай, але ўсё ж змушанай, зафармалізаванай назвай «Праз шторм на штурм» выходзіць толькі ў 1934 г.

Восенню 1936 года Т. Кляшторны быў незаконна арыштаваны, як

вайны, удзельнікам якой Леанід Дзмітрыевіч быў з першага па апошні дзень.

Л. Шчамялёў працуе ў галінах сюжэтна-тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа, нацюрморта. Яго творам уласціва экспрэсіўнасць мастацкай формы, рамантызацыя вобразаў, шматграннасць псіхалагічных характарыстык. У яго работах – не простае адлюстраванне фактаў, з'яў, а развагі пра ўбачанае і перажытае. Яго мастацтва – шчырае, сапраўднае, якое кранае, застаецца ў сэрцы.

Мастак жыве і працуе ў Мінску. У сталіцы Беларусі створана Гарадская мастацкая галерэя твораў Леаніда Шчамялёва. Работы класіка беларускага мастацтва знаходзяцца ў музеях і галерэях розных краін свету.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Кавалёў, В.** Развагі, увасобленыя фарбамі / В. Кавалёў // Літаратура і мастацтва. — 2010. — 2 ліп. — С. 10.

2. **Крепак, Б. А.** Леонид Щемелёв. Краски и ритмы времени / Б. А. Крепак. — Мн. : Маст. літ., 2005. — 303 с.

3. **Леанід** Шчамялёў : народны мастак Рэспублікі Беларусь : альбом / склад. і гал. рэд. А. Прыліпко. — Мн. : Хелмон, 1998. — 126 с.

4. **Час** і прастора Леаніда Шчамялёва : жывапіс XXI : альбом / аўт. тэксту і ўклад. Б. А. Крэпак ; рэд. С. С. Трафілаў ; фота Ю. Іванова, А. Спрынчана. — Мн. : Культура і мастацтва, 2008. — 85 с.

5. **Щемелев** Леонид Дмитриевич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол. : Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. — Т. 7. — С. 630.

23 лістапада – 95 гадоў таму (1918) г. Дрыса (Верхнядзвінск) вызвалены ад нямецкіх акупантаў.

24 лістапада – 100 гадоў таму (1913) нарадзіўся Гарбук Вісарыён Сцяпанавіч, (1913–1986), беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец в. Шкілякі Полацкага раёна.

24 лістапада – 95 гадоў таму (1918) ў Віцебску адкрыўся Пралетарскі ўніверсітэт культуры.

25 лістапада – 115 гадоў таму (1898) нарадзіўся Карпеза Ігнацій Іванавіч (1898–1987), генерал-лейтэнант, ураджэнец в. Кугалеўка Глыбоцкага раёна.

25 лістапада – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Тамашэўскі Іван Герасімавіч (1918–1994), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, маёр, ураджэнец в. Рудніца Сенненскага раёна.

28 лістапада – 85 гадоў таму (1928) нарадзіўся Сушко Іосіф Фаміч, беларускі дзеяч самадзейнага мастацтва, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец в. Прудніки Пастаўскага раёна.

28 лістапада – 40 гадоў таму (1973) нарадзіўся Біндасаў Андрэй Анатольевіч, беларускі спартсмен (радыёспорт), заслужаны майстар спорту Беларусі, чэмпіён свету і Еўропы, ураджэнец г. Полацка.

30 лістапада – 130 гадоў таму (1883) нарадзіўся Аршанскі Бэр (1883–1945), празаік, драматург, літаратуразнавец, публіцыст, ураджэнец г. Гарадка.

30 лістапада – 85 гадоў таму (1928) нарадзілася Арлова Галіна Аляксандраўна, беларуская актрыса, народная артыстка Беларусі, ураджэнка г. Віцебска.

30 лістапада – 15 гадоў таму (1998) ў Оршы заснаваны культурна-асветніцкі цэнтр імя У.С. Караткевіча.

СНЕЖАНЬ

15 гадоў таму (1998) ў Віцебску адноўлена Благавешчанская царква – помнік архітэктуры 12 ст.

4 снежня – 110 гадоў таму (1903) нарадзіўся Лагін Лазар Іосіфавіч (1903–1979), савецкі пісьменнік, аўтар аповесці-казкі для дзяцей "Старик Хоттабыч", ураджэнец г. Віцебска.

5 снежня – 85 гадоў таму (1928) нарадзіўся Камінскі Мікалай Іванавіч (1928–1993), беларускі гісторык, архівіст, ураджэнец в. Масоры Сенненскага раёна.

6 снежня – 140 гадоў таму (1873) нарадзіўся Красавіцкі Пётр Мацвеевіч (1873–1950), краязнавец, ураджэнец г. Віцебска.

6 снежня – 80 гадоў таму (1933) нарадзілася Мажэйка Зінаіда Якаўлеўна, беларускі этнамузыколаг, музыказнаўца, фалькларыст, ураджэнка г. Оршы.

9 снежня – 100 гадоў таму (1913) нарадзіўся Бас Ісідар (сапр. Ізраіль Самуілавіч, крытык, літаратуразнавец, ураджэнец г. Віцебска.

9 снежня – 95 гадоў таму (1918) адбыўся першы канцэрт Віцебскага сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам М.А. Малько (1883–1961).

9 снежня – 90 гадоў таму (1923) нарадзіўся Чэркас Людвіг Станіслававіч (1923–2002), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Парада Перамогі ў Маскве, ураджэнец г. Полацка.

9 снежня – 80 гадоў таму (1933) нарадзіўся Дубаў Георгій Савельевіч (1933–1995), беларускі акцёр, народны артыст Беларусі. З 1964 г. працаваў у тэатры імя Я. Коласа.

13 снежня – 120 гадоў таму (1893) нарадзіўся Пашковіч Мікалай Феліксавіч (1893–1935), беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, ураджэнец г. Глыбокага.

13 снежня – 95 гадоў таму (1918) выйшла пастанова Віцебскага губернскага і гарадскога Саветаў аб арганізацыі Чырвонай гвардыі.

ШЧАМЯЛЁЎ ЛЕАНІД ДЗМІТРЫЕВІЧ
Да 90-годдзя з дня нараджэння (1923)

Шчамялёў Леанід Дзмітрыевіч нарадзіўся 5 лютага 1923 года ў г. Віцебску. Беларускі жывапісец. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны мастак Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны.

У 1956 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Выкладаў у Мінскім мастацкім вучылішчы, а з 1968 года – у Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве. Леанід Шчамялёў – удзельнік мастацкіх выставак з 1958 г. Ён – прыхільнік рэалістычнага стылю ў мастацтве, які зрабіў вялікі ўклад у развіццё нацыянальнай культуры.

За ўсю сваю творчую дзейнасць мастака цікавілі і натхнялі самыя розныя тэмы, сюжэты, вобразы. Мінулае, гісторыя і сучаснасць, родная зямля і чалавек на гэтай зямлі, гераізм і боль Вялікай Айчыннай вайны… Леанід Дзмітрыевіч стварыў многа яркіх твораў, значнае месца сярод якіх займаюць партрэты выдатных дзеячаў Беларусі і Расіі.

У 2010 годзе Л. Шчамялёў стаў лаўрэатам прэстыжнай прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2009–2010 гады за серыю жывапісных работ «Палітра майго часу», якая аб’яднала два цыклы: «Дзеля жыцця на зямлі» і «Гісторыі злучальная ніціна». Сюды ўвайшлі карціны, створаныя ў розныя гады і адзначаныя шырокім грамадскім ды дзяржаўным прызнаннем: «Маё нараджэнне» (1967), «Генерал Даватар» (1975), «Развітанне з Радзімай» (1981), «Музычны Віцебск» (2005). Частка работ прысвечана памяці Вялікай Айчыннай

СССР, 22 гады – дэпутатам вышэйшага заканадаўчага органа ўлады рэспублікі, а ў красавіку 1966 года стаў кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС. У 1978 годзе П. М. Машэраў атрымаў Залатую Зорку Героя Сацыялістычнай Працы. Ён быў узнагароджаны сям'ю ордэнамі Леніна, многімі медалямі.

...4 кастрычніка 1980 года шматграннае актыўнае грамадска-палітычнае жыццё і кіпучая працоўная дзейнасць Пятра Машэрава абарваліся падчас аўтамабільнай катастрофы на Маскоўскай шашы непадалёку ад Мінска. Выдатны сын беларускага народа пахаваны ў Мінску на Усходніх могілках.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Антонович, С. В.** Петр Машеров : документальная повесть / С. В. Антонович. — Мн. : МП «Веснік», 1993. — 288 с.

2. **Мяснікоў, А.** Пётр Машэраў (1918–1980) : пераемнік папярэднікаў / А. Мяснікоў // Сто асоб беларускай гісторыі : гістарычныя партрэты / А. Мяснікоў. — Мн. : Литература и Искусство, 2008. — С. 283—286.

3. **Не говори с тоской, их нет...** : воспоминания о Петре Мироновиче Машерове / сост. М. П. Кузьмич [и др.]. — Витебск : УПП «Витебская областная типография», 2003. — 232 с.

4. **Пронько, О. М.** Семья Машеровых : биографическая повесть / О. М. Пронько. — Гродно : Гродн. тип., 2000. — 292 с.

5. **Это стране моей знак уважения** : сын земли Петр Миронович Машеров / сост. и пер. с белорус. Г. К. Кулябо. — Мн. : Полиграфкомбинат, 2005. — 48 с.

6. **Якутов, В. Д.** Петр Машеров : [партийный и государственный деятель Беларуси] : художественно-документальная повесть / В. Д. Якутов. — Мн. : Культ.-творч. фирма «Русь Белая», 1992. — 270 с.

15 снежня – 70 гадоў таму (1943) г.п. Езярышча вызвалены ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

18 снежня – 40 гадоў таму (1973) нарадзіўся Дзевятоўскі Алег Анатольевіч, беларускі спартсмен (вадналыжны спорт, буксіроўка за катэрам), заслужаны майстар спорту Беларусі, чэмпіён Еўропы і прызёр чэмпіянатаў свету, ураджэнец г. Наваполацка.

19 снежня – 140 гадоў таму (1873) нарадзіўся Гельвіх Пётр Аўгуставіч (1873–1941), генерал-маёр артылерыі, вучоны ў галіне балістыкі і тэорыі стральбы, доктар тэхнічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнец г. Віцебска.

19 снежня – 105 гадоў таму (1908) нарадзіўся Красоўскі Мікалай Ільіч (1908–1982), партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, гісторык, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі, ураджэнец г. Полацка.

19 снежня – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Гнеўка Мікалай Рыгоравіч (1918–1985), беларускі гісторык, педагог, заслужаны настаўнік БССР, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец Бешанковіцкага раёна.

20 снежня – 95 гадоў таму (1918) ў Оршы быў выдадзены першы нумар часопіса "На заре" органа Савета саюза навучэнцаў Оршы.

22 снежня – 95 гадоў таму (1918) нарадзілася Давыдава Вера Сафронаўна (1918–2000), беларускі гісторык, кандыдат гістарычных навук, ураджэнка в. Шарыпы Гарадоцкага раёна.

22 снежня – 90 гадоў таму (1923) нарадзілася Зянькова Ефрасіння Савельеўна (1923–1984), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнка Шумілінскага раёна.

22 снежня – 90 гадоў таму (1923) адбыўся XI з'езд Саветаў Віцебскай губерні.

22 снежня – 60 гадоў таму (1953) нарадзілася Рудэнка Таццяна Аляксандраўна, беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Жыве і працуе ў г. Віцебску.

24 снежня – 70 гадоў таму (1943) г. Гарадок быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

25 снежня – 95 гадоў таму (1918) нарадзілася Канапелька Зінаіда Ігнатаўна (1918–1997), беларуская актрыса, народная артыстка Беларусі, ураджэнка г.п. Багушэўск Сенненскага раёна.

25 снежня – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Мядзведскі Яўген Нікандравіч (1918–2009), вучоны-отарыналарынголаг, заслужаны ўрач БССР, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт, ураджэнец г. Віцебска.

26 снежня – 100 гадоў таму (1913) нарадзіўся Нікалаеў Яўген Дзмітрыевіч (1913–1973), беларускі тэатральны мастак, народны мастак Беларусі. Працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа, з 1944 г.галоўны мастак гэтага тэатра.

27 снежня – 90 гадоў таму (1923) нарадзіўся Вялюгін Анатоль Сцяпанавіч (1923–1994), паэт, кінадраматург, перакладчык, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, ураджэнец в. Машканы Сенненскага раёна.

28 снежня – 15 гадоў таму (1998) ў Полацку адкрыты Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я.

29 снежня – 75 гадоў таму (1938) нарадзіўся Лебедзеў Генадзь Пятровіч (1938–1999), беларускі мастацтвазнавец, краязнавец, гісторык мастацтва, жывапісец, ураджэнец г. Віцебска.

31 снежня – 95 гадоў таму (1918) нарадзіўся Буткевіч Леанід Уладзіміравіч (1918–1985), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Хотліна Чашніцкага раёна.

Ужо вясной 1942 года масава фарміруюцца партызанскія атрады, і ў адным з іх – імя Шчорса, што дзейнічаў на тэрыторыі Расонскага, Дрысенскага, Асвейскага раёнаў Беларусі, а таксама ў суседніх раёнах Расійскай Федэрацыі і Латвіі, 24-гадовы Машэраў становіцца камандзірам. Такіх выпадкаў у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны было няшмат.

Партызанскія атрады ў мэтах вядзення больш маштабных і паспяховых аперацый супраць акупантаў аб'ядноўваліся ў брыгады, а потым – і ў злучэнні. Менш чым праз год – у сакавіку 1943 года – Машэрава прызначаюць камісарам брыгады імя Ракасоўскага, што дзейнічала там жа, на Віцебшчыне. Неўзабаве з Масквы, з Цэнтральнага штаба партызанскага руху, паступае даручэнне аб стварэнні на акупіраванай ворагам тэрыторыі падпольных партыйных і камсамольскіх камітэтаў, і ў верасні 1943 года Пётр Міронавіч становіцца першым сакратаром Вілейскага падпольнага абкама камсамола. А ў ліпені 1944 года, незадоўга да вызвалення паўночна-заходняй часткі Беларусі, ён узначальвае Маладзечанскі абласны камітэт ЛКСМБ.

У тым жа 1944 годзе за мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Пятру Міронавічу Машэраву было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

На камсамольска-маладзёжнай ніве ён працаваў яшчэ роўна 10 гадоў. З'яўляўся сакратаром, а потым – з кастрычніка 1947 года – Першым сакратаром Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ. Быў душой, завадатарам і арганізатарам многіх спраў і маладзёжных ініцыятыў. Шлях з камсамола ляжаў у партыйныя структуры – такой была тады службовая кар'ера шчырых і адданых сыноў партыі. У ліпені 1954 года П. Машэраў атрымаў высокую і адказную пасаду другога сакратара Мінскага абласнога камітэта партыі. У жніўні 1955 года ён узначаліў Брэсцкую абласную партыйную арганізацыю. З красавіка 1959 года Пётр Машэраў – сакратар, са снежня 1962 года – другі сакратар, а з сакавіка 1965 года – першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Пётр Міронавіч 26 гадоў з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета

: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2009. — С. 117—128.

2. **Трущенко, Е.** Главное – не стареть душой / Е. Трущенко // Мы і час (Віцебск). — 2009. — 30 мая. — С. 2.

3. **Кучеренко, В.** Алексей Сапунов. История одной фотографии / В. Кучеренко // Віцьбічы = Витьбичи. — 2010. — 17 апр. — С. 10.

ЛЮТЫ



МАШЭРАЎ ПЁТР МІРОНАВІЧ
Да 95-годдзя з дня нараджэння (1918)

Машэраў Пётр Міронавіч нарадзіўся 26 лютага 1918 года ў вёсцы Шыркі Сенненскага раёна ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння рабфака і Віцебскага педагагічнага інстытута ў 1939 годзе ён больш за два гады выкладаў фізіку і матэматыку ў Расонскай сярэдняй школе.

Калі нямецка-фашысцкія захопнікі напалі на нашу краіну, малады настаўнік, якога любіла і паважала мясцовае насельніцтва, ужо ў жніўні 1941 года стварыў і ўзначаліў Расонскае партыйна-камсамольскае падполле. Пятру Міронавічу верылі, да яго слоў прыслухоўваліся, таму мясцовыя жыхары ахвотна давяралі яму свае лёсы, а нярэдка – і жыцці.

СТУДЗЕНЬ



АЗГУР ЗАІР ІСААКАВІЧ
Да 105-годдзя з дня нараджэння (1908)

Азгур Заір Ісаакавіч нарадзіўся 15 студзеня 1908 года ў в. Маўчаны Сенненскага раёна. Беларускі скульптар. Народны мастак Беларусі (1944) і СССР (1973). Правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР (1978). Герой Сацыялістычнай Працы (1978). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946).

У 1921 годзе пачаў вучыцца маляванню ў прыватнай майстэрні віцебскага жывапісца Ю. Пэна. Потым – Віцебскі мастацка-практычны інстытут. Затым – другі курс Віцебскага мастацкага тэхнікума. Гэты перыяд вызначаўся зваротам мастакоў да мінулага свайго народа, да яго этнаграфіі і фальклору. Там чыталася гісторыя беларускага мастацтва, працавала майстэрня керамікі, дзе рабіліся спробы адраджэння беларускай мастацкай кафлі, якой калісьці славілася Беларусь. Па заданні краязнаўчага гуртка яго члены, у тым ліку і Азгур, займаліся зборам экспанатаў для краязнаўчага музея, што існаваў пры тэхнікуме, рабілі замалёўкі арнаментаў, адзення, помнікаў архітэктуры. Навучэнцы ўдзельнічалі ў рэспубліканскіх выставах.

У 1925 г. Заір Азгур атрымаў заказ на выкананне скульптурнага партрэта песняра Беларусі Якуба Коласа для Віцебскага краязнаўчага музея. У тым жа годзе Заір Азгур вылепіў партрэт Янкі Купалы. І гэта ў 17

гадоў!

У 1927 г. юнак стварыў партрэт Францыска Скарыны. Увогуле маладога скульптара прыцягвала велічыня постаці. Чалавек, якому ўсходняе славянства абавязана першымі друкаванымі кнігамі, быў менавіта такой асобай.

Пры заканчэнні тэхнікума Азгур атрымаў такую атэстацыю: «Здольнасці да разьбярства – выдатныя». Хутка выпускнік тэхнікума паехаў павышаць сваю адукацыю ў Ленінградскую акадэмію мастацтваў, дзе вучыўся ў вядомых скульптараў таго часу Р. Баха, М. Манізера, У. Лішава. Але прага да спасціжэння прафесійных навыкаў, чалавечых пачуццяў зноў паклікала ў дарогу. Вучыўся ў Кіеўскім мастацкім інстытуце, Тбіліскай акадэміі мастацтваў.

У 1930 г. З. Азгур вяртаецца ў Беларусь. У гэты час ім былі створаны цудоўныя партрэты Уладзіслава Галубка (1930), Ларысы Александроўскай (1939), Змітрака Бядулі (1940). Сярод значных твораў Заіра Азгура, створаных пасля Вялікай Айчыннай вайны, партрэты многіх дзеячаў нацыянальнай культуры – Францыска Скарыны, Алаізы Пашкевіч (1947), Кандрата Крапівы, Якуба Коласа (1949) і інш.

Вельмі цікавай работай скульптара з'яўляецца бюст Рабіндраната Тагора (1956) з чорнага і шэрага граніту. За яго Азгур атрымаў прэмію на Міжнароднай выставе ў Бруселі.

У 1972 г. быў адкрыты помнік Якубу Коласу ў Мінску на плошчы, што носіць імя песняра. У 1980 г. Заірам Азгурам быў створаны партрэт Міколы Гусоўскага.

Працаваў у галіне станковай і манументальнай скульптуры. Удзельнічаў у шматлікіх мастацкіх выставах. У канцы 1920-х – 1930-я гг. стварыў партрэты дзеячаў сацыялістычнага і рэвалюцыйнага руху для Дома ўрада ў Мінску. Сярод твораў: партрэты герояў Вялікай Айчыннай вайны В. Талаліхіна, А. Радзімцава, А. Малодчага, М. Сільніцкага, Ф. Смалячкова, В. Талаша, М. Шмырова, К. Ракасоўскага, П. Батава, прадстаўнікоў айчыннай і сусветнай культуры Ф. Скарыны, А. Бразера, З.

даручыць Н. І. Дарафеенцы, М. У. Дарафеенку і М. І. Пахомаву падрыхтаваць кнігу «Витебское падполье», што было зроблена аператыўна: ужо ў 1969 г. яна ўбачыла свет.

У працэсе даследавання Н. І. Дарафеенка вярнула светлае імя многім людзям, на якіх ляжаў цень падазрэння. Шмат намаганняў прыклала Н. І. Дарафеенка і для таго, каб у Віцебску былі адкрыты помнікі і мемарыяльныя дошкі падпольшчыкам. Менавіта Ніна Іванаўна выступіла ініцыятарам распрацоўкі праблемы ўдзелу дзяцей Віцебшчыны ў барацьбе супраць фашысцкіх акупантаў.

Н. Дарафеенка стала аўтарам артыкулаў, прысвечаных віцебскаму патрыятычнаму падполлю, у энцыклапедычных выданнях. Яна прыняла актыўны ўдзел у стварэнні кнігі «Памяць» г. Віцебска. Акрамя двух грунтоўных артыкулаў: абагульняючага, прысвечанага віцебскаму падполлю, а таксама артыкула пра дзейнасць Веры Харужай у Віцебску, пяру Ніны Іванаўны належыць даведачная інфармацыя пра падпольныя групы і пра ўшанаванне памяці віцебскіх падпольшчыкаў. Важным накірункам навуковай працы Ніны Іванаўны было даследаванне подзвігу Веры Харужай у Віцебску.

І па сённяшні дзень яна застаецца фактычна адзіным экспертам па праблемах гісторыі віцебскага падполля, яе навуковыя працы не згубілі актуальнасці. Вынікі даследаванняў Н. І. Дарафеенкі выкарыстоўваюцца ў навучальна-выхаваўчым працэсе ў школах і вышэйшых навучальных установах, рабоце музеяў Віцебшчыны.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Дулаў, А. М.** Н. І. Дарафеенка – удзельніца руху Супраціўлення і даследчыца Віцебскага падполля / А. М. Дулаў // Віцебшчына ў 1941—1944 гг. : Супраціў. Вызваленне. Памяць : матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18—19 чэрвеня 2009 г. / рэдкал.: В. У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.] ; УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» [і інш.]. — Віцебск

разведчыкамі. Дзяўчаты займаліся разведкай, здабывалі даныя пра нямецкі гарнізон у Суражы. У лістападзе 1942 г. удзельніцы арганізацыі сталі партызанкамі брыгады «Аляксея».

У гады вайны Ніна Іванаўна страціла сям'ю. Яна вярнулася дадому з хворымі нагамі і моцна сапсаваным зрокам, а на месцы хаты знайшла толькі комін і дзядоўнік. Пасля вызвалення Суражчыны, як толькі дазволіла здароўе, Ніна Маісеева пайшла працаваць настаўніцай, у хуткім часе стала дырэктарам пачатковай школы. Паралельна з настаўніцкай працай Ніна Іванаўна займалася камсамольскай дзейнасцю, была абрана сакратаром райкама камсамола. Адчуваючы недахоп ведаў, у 1946 г. яна стала студэнткай завочнага аддзялення гістарычнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута. Маладой настаўніцы дазволілі наведваць заняткі адначасова і на матэматычным факультэце, бо ў школе яна вяла два прадметы. Менавіта ў час вучобы ў Віцебску Ніна Іванаўна зрабіла першы крок да вывучэння падпольнай і партызанскай барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля заканчэння двух курсаў Віцебскага педінстытута Ніна Маісеева вырашыла паехаць вучыцца ў г. Молатаў (Перм), дзе жыў яе дзядзька. У Молатаве яна не толькі выдатна вучылася, але і займалася камсамольскай працай. У 1949 г. пасля заканчэння гістарычнага факультэта Молатаўскага (Пермскага) педінстытута Ніна вярнулася на радзіму. У Віцебску Ніна Іванаўна стала працаваць у абкаме КПБ, у аддзеле народнай адукацыі. Затым перайшла на працу ў Віцебскі медыцынскі інстытут, дзе загадвала кабінетам марксізму-ленінізму і вяла заняткі. У 1956 г. Н. І. Дарафеенка закончыла Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. З 1962 па 1980 год яна выкладала гісторыю партыі ў Віцебскім педінстытуце імя С. М. Кірава. У 1978 г. Ніне Іванаўне было прысвоена званне «Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР». У 1968 г. Н. Дарафеенка паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю па гісторыі Віцебскага падполля, працу над якой вяла на працягу папярэдніх гадоў. Пасля абароны дысертацыі Віцебскі абкам КПБ прыняў рашэнне

Бядулі, Л. Александроўскай, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гусоўскага, К. Чорнага, Р. Тагора, Лу Сіня, У. Уітмена, кіраўнікоў камуністычных і рабочых партый, нацыянальна-вызваленчага руху, палкаводцаў, герояў працы, вучоных. Па яго праектах створаны помнікі У. Леніну ў Беларусі, Расіі і Казахстане, П. Машэраву ў Віцебску, Я. Коласу і С. Грыцаўцу ў Мінску, Я. Купалу ў Вязынцы, В. Талашу ў Петрыкаве, А. Бутлераву і Я. Вучэцічу ў Маскве. Аўтар барэльефа «Слава загінуўшым героям» для помніка-абеліска Перамогі ў Мінску. У 1960-я гады стварыў шэраг партрэтаў беларускіх вучоных (М. Яругін, 1963; Б. Сцяпанаў, 1964), артыстаў (І. Балоцін, 1966, У. Крыловіч, 1967). Напісаў мемуары «Незабыўнае», «Тое, што помніцца...», шмат публіцыстычных артыкулаў па мастацтве.

Заір Азгур быў чалавекам незвычайнага працалюбства і вялікай занятасці, але ніколі не адмаўляўся ад грамадскай дзейнасці – быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, браў удзел у шматлікіх камісіях Міністэрства культуры і Саюза мастакоў. Пра грамадзянскую свядомасць Заіра Азгура яскрава сведчыць яго пазіцыя ў пытаннях беларускай культуры і мовы: «Без адраджэння высокай моўнай культуры немагчымы рух і ў духоўным, і эканамічным жыцці народа».

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Дружбы народаў, Чырвонай Зоркі.

Памёр 18 лютага 1995 г. Пахаваны ў Мінску. Яго імя прысвоена СШ № 1 г. Сянно. У Мінску, які вельмі любіў З. Азгур, створаны музей, яму прысвечаны. Горад аддае даніну памяці і павагі мастаку.

ЛІТАРАТУРА:

1. Азгур Заир Исаакович // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич (пред.) [и др.]. — Витебск : Витеб. обл. тип., 2009. — С. 193.

2. **Азгур** Заір Ісакавіч // Памяць : Сенненскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. С. В. Шайко ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Паліграфафармленне, 2003. — С. 546.

3. **Багданава, А.** Партрэтны летапіс эпохі / А. Багданава // Роднае слова. — 2008. — № 1. — С. 98—102.

4. **Заір Ісакавіч Азгур** : да 70-годдзя з дня нараджэння : каталог / уклад.: П. М. Герасімовіч [і інш.]. — Мн. : Беларусь, 1979. — 40 с.

5. **Ільмоўская, І.** Мастак, што ажыўляў камень / І. Ільмоўская // Бібліятэка прапануе. — 2008. — № 1. — С. 26—27.

6. **Мяснікоў, А**. Заір Азгур (1908—1995) / А. Мяснікоў // Сто асоб беларускай гісторыі : гістарычныя партрэты / А. Мяснікоў. — Мн. : Литература и Искусство, 2008. — С. 259—261.

7. **Рогинская, Ф. С.** Заир Исаакович Азгур / Ф. С. Рогинская. — М. : Изд-во Акад. художеств СССР, 1961. — 92 с.

ДАРАФЕЕНКА НІНА ІВАНАЎНА
Да 90-годдзя з дня нараджэння (1923)

Ніна Іванаўна Дарафеенка (дзявочае прозвішча – Маісеева) з'явілася на свет 10 студзеня 1923 г. у вёсцы Уласава Віцебскага раёна ў сялянскай сям'і. Дзяўчына марыла стаць настаўніцай. Пасля заканчэння беларускай школы ў Суражы Ніна Маісеева паступіла на хімічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Але ў хуткім часе была ўведзена плата за навучанне. Бацькі не маглі дапамагчы дачцэ фінансава, таму яна вымушана была пакінуць універсітэт. Ніна вярнулася дадому. Калі яна даведалася, што ў Віцебскім педагагічным інстытуце будзе ажыццяўляцца набор на шасцімесячныя педагагічныя курсы, то

вырашыла паступаць. Дзяўчына заканчвала курсы, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Заняткі сталі нерэгулярнымі, праводзіліся ў інтэрнаце. Будынак інстытута быў пераабсталяваны пад шпіталь для параненых чырвонаармейцаў. Студэнты ўдзельнічалі ў стварэнні абарончых збудаванняў за горадам, ноччу дзяжурылі на пастах супрацьпаветранай абароны.

На пачатку ліпеня 1941 г. Ніна Іванаўна атрымала дакумент аб заканчэнні курсаў і дазвол на выезд з горада. Толькі дзяўчына вярнулася ў родную вёску Уласава, як гітлераўцы занялі Сураж. У вёсках было шмат моладзі, якая вярнулася з вучобы і з гарадскіх прадпрыемстваў. Ніна Іванаўна ўспамінае, што многія выказваліся пра неабходнасць барацьбы з акупантамі, але ніхто не ведаў, з чаго трэба пачынаць. Стваральнікам мясцовага патрыятычнага падполля стаў камсамолец Фёдар Міхайлавіч Іваноў, які ў 1941 г. скончыў фізіка-матэматычны факультэт Віцебскага педінстытута. Малады настаўнік пачаў весці агітацыю, гуртаваць вакол сябе моладзь. Ф. М. Іваноў разам са сваім сябрам, настаўнікам С. Емельянавым з вёскі Рабава, сабралі радыёпрыёмнік і слухалі перадачы з Масквы. Да лістапада 1941 г. вакол Ф. М. Іванова склалася падпольная група, у якую разам з настаўнікамі і камсамольцамі ўвайшлі беспартыйныя сяляне з навакольных вёсак.

Падпольшчыкі пачалі дзейнічаць. Восенню 1941 г. Ніна Іванаўна разам з бацькам вывезлі з Суража параненага байца знішчальнага батальёна Уладзіміра Гарланава. Зімою 1941 г. падпольшчыкі збіралі зброю, перашкаджалі акупантам нарыхтоўваць прадукты харчавання і фураж. Вялікая ўвага надавалася агітацыі. Таксама падпольшчыкі здабывалі звесткі пра дзейнасць фашыстаў і дапамагалі партызанам.

У выніку праведзенай падпольшчыкамі работы ў красавіку 1942 г. мужчыны вёсак Стукальна і Уласава арганізавана пайшлі ў партызанскі атрад «Крэпасць». Дзяўчаты-падпольшчыцы стварылі пярвічную камсамольскую арганізацыю, сакратаром якой была абрана Ніна Іванаўна. Арганізацыя супрацоўнічала з партызанамі, а потым і з армейскімі